16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 41 (5198) 14 кастрычніка 2022 г.

ISSN 0024-4686

Адказнасць перад часам стар. 4

Пісьменніцкае жыццё вобласці стар. 6

Паказы, сустрэчы, дыскусіі стар. 13

Бліскучая творчасць і ўсёабдымная любоў

Фота БелТА.

Ігар Луцкі ўручае падзяку Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталлі Шыянок.

Напярэдадні Дня работнікаў культуры ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага 5 кастрычніка адбылося ўрачыстае мерапрыемства, падчас якога самыя актыўныя і адметныя работнікі сферы атрымалі ўзнагароды і дыпломы. У Год гістарычнай памяці свята набыло асаблівы сэнс: менавіта праз культуру захоўваюцца традыцыі продкаў, а таксама ствараецца новае, асэнсоўваецца час і выхоўваецца годнае маладое пакаленне.

З віншавальнымі словамі да лаўрэатаў звярнуўся міністр культуры Анатоль Маркевіч, адзначыўшы, што да свята мае дачыненне больш за 42 тысячы чалавек: акцёры, пісьменнікі, мастакі, работнікі музейнай і бібліятэчнай сферы, кінематаграфісты.

— Сваёй працай і талентам вы славіце беларускую культуру і ствараеце выдатны настрой. Наша свята маладое, яно было заснавана ў 1998 годзе, але беларуская культура мае шматвяковую гісторыю. Работнік культуры — гучыць некалькі афіцыйна, але ва ўсіх прафесіях, аб'яднаных гэтым словам, заўсёды знаходзіцца бліскучая творчасць, вялікае цярпенне і ўсёабдымная любоў, — падкрэсліў міністр культуры. — З вамі вельмі камфортна і надзейна працаваць. Нягледзячы на ўсе перыпетыі, мы заўсёды знаходзім ісціну і дасягаем пастаўленых мэт. Я часта параўноўваў работу ў культуры з рэальным сектарам эканомікі і зразумеў, што наша праца не лягчэйшая, чым у полі ці каля станка. Бо сфера культуры — тая галіна з бесперапынным вытворчым цыклам, дзе творчы працэс не запавольваецца ні на секунду. У выніку мы атрымліваем выдатны, непаўторны культурны прадукт.

Працяг на стар. 2 ►

«ЛіМ»-акцэнты

Узнагароды. Старшыня Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» Радзік Батыршын узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Адпаведны Указ № 362 падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік тэлерадыёкампаніі ўдастоены ўзнагароды за значны асабісты ўклад ва ўмацаванне міру, дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі, плённую работу па збліжэнні і ўзаемаўзбагачэнні нацыянальных культур, фарміраванні і развіцці адзінай інфармацыйнай прасторы, высокія дасягненні ў дабрачыннай і гуманітарнай дзейнасці.

Нарада. Вызная нарада па пытаннях правядзення рамонтна-рэстаўрацыйных работ, у якой прыняла ўдзел старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, прайшла ў Свята-Успенскім Жыровіцкім стаўрапігіяльным мужчынскім манастыры. Наталля Качанава нагадала, што пры наведванні ў 2021 годзе манастыра Прэзідэнт паставіў дакладную задачу — адрамантаваць храм, які знаходзіцца на яго тэрыторыі, а таксама прывесці ў ідэальны стан аграгарадок Жыровічы. Для гэтага была распрацавана праграма на навядзенні парадку ў Жыровічах і рамонтных работах у манастыры. «Інвестыцыйнай праграмай дакладна вызначана фінансаванне на гэты год. Па некаторых пытаннях трэба паскорыцца, таму што ў цэлым усё, што прадугледжана праектна-каштарыснай дакументацыяй па храме, павінна быць выканана ў гэтым годзе», — сказала спікер.

Фестывалі. XXVIII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» пройдзе пад слоганам «Сапраўдныя каштоўнасці», паведаміла журналістам намеснік начальніка аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Ганна Нікіціна, перадае карэспандэнт БелТА. Для арганізацыі усёй дзейнасці па падрыхтоўцы і правядзенні фестывалю створаны пастаянна дзеючы арганізацыйны камітэт пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі. На чарговым пасяджэнні, праведзеным 10 кастрычніка, акрамя слогана зацверджаны склады журы, а таксама візуальнае рашэнне кінафестывалю. У найбліжэйшы час плануецца запусціць шырокую рэкламную акцыю аб правядзенні фестывалю, які пройдзе з 4 да 11 лістапада. Арганізатары мерапрыемства — Міністэрства культуры, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. У гэтым годзе дырэкцыяй кінафестывалю вызначана Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм».

• Міністэрства інфармацыі ўзнагародзіла фіналіста Міжнароднага фестывалю дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія.DOC», урачыстая цырымонія закрыцця якога прайшла ў кінатэатры «Беларусь» у Мінску. Прыз Міністэрства інфармацыі атрымаў фільм беларускага рэжысёра Яўгена Сяцько «Перазвон». Міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў падкрэсліў, што фестывальны Мінск стаў пляцоўкай, дзе можна дыскутаваць і абменьвацца меркаваннямі. Дакументалісты не проста фіксавалі перадкамерную прастору, а стваралі летапіс.

Конкурс. Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў штогадовага рэспубліканскага творчага конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава» пройдзе 20 кастрычніка ў рамках выязнога круглага стала ў Мінскім храме-помніку ў гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню Айчыны нашай. На падставе рашэння журы дыпломы і грашовыя ўзнагароды ў памеры 11 базавых велічынь атрымаюць 12 удзельнікаў. Усяго было прадстаўлена 135 работ ад 101 рэдакцыі СМІ (4 — ад рэспубліканскіх друкаваных СМІ, 87 — рэгіянальных друкаваных СМІ, 1 — рэспубліканскага і 9 — рэгіянальных электронных СМІ). Конкурс праводзіўся па наступных намінацыях: «Лепшыя матэрыялы ў друкаваных рэспубліканскіх СМІ»; «Лепшыя матэрыялы ў друкаваных рэгіянальных СМІ»; «Лепшыя матэрыялы, якія выйшлі ў эфір рэспубліканскіх тэлевізійных ці радыёвяшчальных СМІ»; «Лепшыя матэрыялы, якія выйшлі ў эфір рэгіянальных тэлевізійных ці радыёвяшчальных СМІ»; «Лепшыя фотаматэрыялы ў друкаваных рэспубліканскіх СМІ»; «Лепшыя фотаматэрыялы ў друкаваных рэгіянальных СМІ». Арганізатары конкурсу — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і ГА «Беларускі саюз жанчын».

Рэгіёны. У Палескім драматычным тэатры ставяць спектакль па п'есе Фрыдрыха Шылера «Прынцэса Турандот», паведамляе БелТА. Казачнай гісторыяй аб цудоўнай, але бязлітаснай кітайскай прынцэсе натхніўся рэжысёр Павел Марыніч — пастаноўшчык такіх яркіх спектакляў на гістарычную тэму, як «Уяўны хворы», «Раскіданае гняздо», «Чорная панна Нясвіжа», «Вій». Жанр спектакля заяўлены як казка для дарослых у дзвюх дзеях. Насычанасць сюжэту падзеямі робіць пастаноўку вельмі дынамічнай. У ёй шмат дзеянняў, якія суправаджаюцца музыкай, танцамі, цырыманіяламі. Плюс яркія стылізаваныя касцюмы, грым і прычоскі персанажаў, багатыя дэкарацыі.

Агляд афіцыйных падзей ад Алеся ЦІМАФЕЕВА

з нагоды

Бліскучая творчасць і ўсёабдымная любоў

Падчас адкрыцця цырымоніі намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар Луцкі агучыў віншаванне Аляксандра Лукашэнкі, у якім гаворыцца, што беларуская культура з'яўляецца ўнікальнай духоўнай скарбніцай народа, невычэрпнай крыніцай нашай самабытнасці і нацыянальнай годнасці. Прэзідэнт падкрэсліў, што найвышэйшым прызначэннем работнікаў культуры з'яўляецца адраджэнне народных традыцый і рамёстваў, захаванне гістарычнай памяці, стварэнне новых сучасных твораў мастацтва, а таксама выхаванне таленавітай моладзі. Дыпломамі і падзякамі работнікаў культуры адзначылі таксама Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў, Савет Рэспублікі і Нацыянальны сход. Свае віншаванні накіравалі старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава і прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка.

Лаўрэатаў прэміі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ў сферы культуры і мастацтва вызначылі ў шасці намінацыях.

Дыплом у катэгорыі «Літаратура, журналістыка, крытыка» атрымаў рэдактар аддзела культурнага жыцця рэдакцыі газеты «Гомельскія ведамасці» Дзмітрый Чарняўскі.

У намінацыі «Тэатральнае, экраннае, цыркавое мастацтва» найлепшым стаў Народны тэатр Краснапольскага раённага Цэнтра культуры.

Дыплом у намінацыі «Жывапіс, скульптура, графіка, дызайн і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» ўручылі Алене Катоўскай, бібліятэкару першай катэгорыі Лескаўскай сельскай бібліятэкі.

Узнагароду ў катэгорыі «Народная творчасць» атрымаў заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, ансамбль танца, музыкі і песні «Белыя росы».

У намінацыі «Бібліятэчная справа» лаўрэатам стала Таццяна Барабаншчыкава, намеснік дырэктара Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя Леніна.

Дыплом у намінацыі «Музейная справа» ўручылі Брэсцкаму абласному краязнаўчаму музею.

З нагоды прафесійнага свята ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага таксама адбылася цырымонія ўзнагароджання супрацоўнікаў апарату Міністэрства культуры і работнікаў устаноў адукацыі ў сферы культуры. Падчас узнагароджання міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй Іванец адзначыў, што духоўная і маральная аснова з'яўляецца базісам пры фарміраванні асобы нашай моладзі:

— Сёння кожны з нас павінен быць не толькі адукаваным, але і выхаваным на нашых традыцыях, культуры, гісторыі. Менавіта гэтую працу робіце вы, дзякуючы гэтаму мы можам быць упэўнены, што заўтра прыйдуць выхаваныя, культурныя маладыя людзі, якія сфарміруюць будучыню нашай краіны — моцнай, незалежнай, квітнеючай Беларусі.

Прыемным фіналам святочнага мерапрыемства стаў паказ спектакля «Граф Монтэ-Крыста» рэжысёра-пастаноўшчыка Сяргея Кавальчыка, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

Арына КАРПОВІЧ

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Выхаваць патрыёта

У Мемарыяльнай зале Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбыўся першы ў гэтым навучальным годзе Урок мужнасці. Яго адкрылі рэспубліканскім літаратурна-мастацкім праектам «Бачу беларусь такой» Алена Стэльмах і Уладзіслаў Цыдзік.

— Традыцыя правядзення ўрокаў мужнасці ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі пачалася з 2011 года, калі адбылася сустрэча Кіраўніка нашай дзяржавы А. Р. Лукашэнкі з пісьменніцкай грамадскасцю. Тады асаблівую ўвагу засяродзілі на неабходнасці больш грунтоўнага падыходу да патрыятычнага выхавання моладзі. Было сказана: каму, як не пісьменнікам, на ўзорах айчыннай літаратуры весці гаворку аб позвігу і славе нашага народа, — заўважае першы намеснік старшыні СПБ Алена Стэльмах.

Спачатку сустрэчы з моладдзю актыўна вялі пісьменнікі старэйшага пакалення, тыя, хто прайшоў дарогамі вайны, быў відавочцам і ўдзельнікам падзей Вялікай Айчыннай вайны. З цягам часу эстафету прынялі маладзейшыя літаратары.

Практычна няма таго аўтара, якога б не кранала тэма гераізму, мужнасці — высокіх маральных якасцей, патрэбных чалавеку ў любы час. Таму і сённяшнія дыялогі з моладдзю — адкрытая і шчырая размова аб стварэнні жыццёвага стрыжня, аб духоўных складніках фарміравання асобы. Гераізм неабходны не толькі на вайне.

Распрацаваная Саюзам пісьменнікаў Беларусі праграма правядзення ўрокаў мужнасці, якую зацвердзіў чарговы прэзідыум СПБ, сведчыць пра рознабаковы падыход да тэматыкі напоўненасці мерапрыемстваў. Наведвальнікі

Урок мужнасці ў мемарыяльнай зале СПБ.

пазнаёмяцца з гісторыяй беларускай дзяржаўнасці, з героямі нашага часу. Да правядзення Урокаў мужнасці запрошаны пісьменнікі, чые імёны маюць важкі аўтарытэт у грамадстве: Міхась Пазнякоў, Віктар Праўдзін, Ніна Чайка, Іван Юркін, іншыя майстры мастацкага слова.

Па інфармацыі Мінскага гарадскога камітэта па адукацыі, удзел ва ўроках мужнасці прымуць школьнікі ўсіх раёнаў горада Мінска, а таксама навучэнцы сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі беларускай сталіцы. У 2022/2023 навучальным годзе адбудзецца шаснаццаць такіх памятных урокаў.

Марыя ЛІПЕНЬ
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

Пашыраючы супрацоўніцтва

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны прайшла рабочая сустрэча старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктара — галоўнага рэдактара Выдавецкага дома «Звязда» Алеся Карлюкевіча з рэктарам універсітэта доктарам фізіка-матэматычных навук Сяргеем Хахомавым.

У пісьменніцкай арганізацыі краіны наладжаны добрыя стасункі з галоўным універсітэтам Гомельшчыны. Неаднойчы кіраўнік СПБ выступаў перад студэнтамі і выкладчыкамі. Гэтым разам размова ішла пра арганізацыю міжнароднага круглага стала, прысвечанага беларуска-кітайскім гуманітарным, культурным і літаратурным сувязям. Мяркуецца, што такое мерапрыемства пройдзе ва ўніверсітэце пры падтрымцы СП Беларусі і Выдавецкага дома «Звязда» напрыканцы лістапада. Ёсць дамоўленасць пра ўдзел у круглым стале ў фармаце анлайн з кітайскага боку Цэнтра даследаванняў Беларусі Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў.

У Гомельскім універсітэце, дзе вучацца і абараняюць навуковыя працы кітайскія студэнты і магістранты, ёсць усе падставы для пашырэння пляцовак беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Удзел у размове прыняў і загадчык кафедры беларускай літаратуры доктар філалагічных навук Іван Штэйнер. Ён, дарэчы, шмат працуе і са студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі з Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

не абмініце

Трэцяе выданне «Прыгод дамавічкоў»

Ягора Конева, кандыдата філалагічных навук, сцэнарыста і драматурга, журналіста, добра ведаюць у нашай краіне. Выкладчык факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, ён актыўна працуе ў мастацкай літаратуры. З 1998 года — член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі (2016).

У Выдавецкім доме «Звязда» ўжо трэцім выданнем выходзіць кніга Я. Конева, адрасаваная самым юным чытачам, «Прыгоды дамавічкоў». Першыя прыйшлі да пакупніка і чытача ў ранейшыя гады — у 2021-м і 2020-м.

Нагадаем, што Ягор Конеў з'яўляецца аўтарам аповесцей «Здані Гарадніцы», «Новыя палескія рабінзоны», «Глеб Менскі» і іншых прыгодніцкіх і гісторыка-прыгодніцкіх твораў. Таксама пяру літаратара належаць п'есы «Старажытны перыяд, або Гісторыя і каханне», «Калядная зорка», «Забойца з роду Дастаеўскіх» і іншыя.

Агульны тыраж трох выданняў «Прыгодаў дамавічкоў» складае 3100 экзэмпляраў.

Мікола БЕРЛЕЖ

праекты

Музеі разам з кіно

Да 140-годдзя з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа ў Год гістарычнай памяці 5 кастрычніка 2022 года ў сценах музея Якуба Коласа адбылося падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве музеяў класікаў і кінастудыі «Беларусьфільм».

Фота Кастуся Дробава.

Падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве.

Дагавор аб пашырэнні супрацоўнітва падпісалі дырэктар Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Ірына Мацяс, дырэктар літаратурнага музея Янкі Купалы Ганна Галінская і генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі.

— «Беларусьфільм» не проста прадпрыемства, дзе робяць кіно, а перадусім нацыянальная кінастудыя, а значыць, і распавядаць павінны пра нашых. У апошнія гады мы актыўна супрацоўнічаем як з замежнымі, так і з беларускімі культурнымі арганізацыямі. У Год гістарычнай памяці хацелася б больш распавядаць пра нашу краіну, пра тых, кім ганарымся, — заявіў Уладзімір Карачэўскі.

Падчас сустрэчы было абвешчана аб падрыхтоўцы новага дакументальнага фільма пра Якуба Коласа. Адзін з эпізодаў жыцця паэта, перыяд эвакуацыі ў Ташкенце, увасобіцца ў 40-хвілінны фільм «Якуб Колас. Кніга Ташкенцкага быцця». Сцэнарыст — Уладзімір Мароз, рэдактар студыі «Летапіс».

Валянцін САЛОМА

вернісаж

Колер натхнення

6 кастрычніка адбылося адкрыццё выстаўкі Эльвіры Салавянчык, мастачкі, выкладчыцы гімназіі № 10 г. Мінска. Яркія і пярэстыя карціны размясціліся ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. Гэта не першая выстаўка Эльвіры Салавянчык, але асабліва доўгачаканая і няпростая ў падрыхтоўцы.

— У кожны момант жыцця я ствараю па-новаму. Тут і пастэль, і алей, і акварэль, і мініяцюра, і паштоўкі. Мае творы можа ўбачыць нават на сценах. Усё залежыць ад стану душы, ад таго, што мяне натхняе. Галоўнае — схапіць момант і перадаць, — распавяла на адкрыцці мастачка.

Эльвіру Адамаўну натхняюць афрыканскія матывы, тэма Усходу, жаночыя вобразы і сучасныя песні расійскай эстрады. Ідэі светабудовы і надчалавечага досведу моцна хвалююць аўтарку. Да кожнай карціны мастачка падыходзіць грунтоўна, шукаючы новае асэнсаванне і неабходны стыль.

Творы Эльвіры Салавянчык напоўнены сімвалізмам, разнастайнасцю колеру і святлом. На выстаўку да сваёй настаўніцы завіталі і вучні з розных школ, каб падтрымаць выкладчыцу.

Валянцін САЛОМА

імпрэзы

Ушанавалі класіка казахскай літаратуры

У сталічнай сярэдняй школе № 143 імя Мухтара Аўэзава адбылося літаратурнае свята, прымеркаванае да 125-годдзя з дня нараджэння класіка казахскай літаратуры Мухтара Аўэзава.

Ганаровымі гасцямі сталі супрацоўнікі Пасольства Рэспублікі Казахстан і старшыня мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў.

З прывітальнымі словамі перад прысутнымі выступілі дырэктар школы Вадзім Панасевіч і саветнік Пасольства Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь Асхат Мукашаў. Навучэнцы школы ў нацыянальным казахскім адзенні прывіталі гасцей вершамі на казахскай мове, расказалі пра жыццёвы і творчы шлях М. Аўэзава.

Але галоўным выступоўцам быў пісьменнік і перакладчык Міхась Пазнякоў, які ў мінулым годзе па просьбе Пасольства Рэспублікі Казахстан у Беларусі пераклаў на беларускую мову чатырохтомны раман-эпапею Мухтара Аўэзава «Шлях Абая». Ён расказаў аб працы над перакладам гэтага класічнага твора на беларускую мову, падзяліўся сваімі меркаваннямі аб высокіх вартасцях рамана-эпапеі, паведаў аб пашырэнні творчых сувязей паміж краінамі. Міхась Пазнякоў вёў дыялог з вучнямі, адказаў на іх шматлікія пытанні. Калі ж у яго запыталі, якія рысы характару класіка казахскай літаратуры і галоўнага героя рамана-эпапеі Абая Кунанбаева яму па душы, шаноўны перакладчык адказаў: яго клопат аб простых людзях, добразычлівасць, павага да чалавека працы, сціпласць і працавітасць, самаахвярнае служэнне народу, сумленнасць і справядлівасць, любоў да Радзімы. А гэта — асноўныя ўмовы, каб стаць паспяховым і шчаслівым і ў наш час.

Павел КУЗЬМІЧ, фота аўтара

да ведама

Папулярызаваць вобраз жанчыны

«Вы — пачатак прыгажосці, вы — жыцця першапрычына» — такая назва конкурсу творчых работ, які абвясцілі Саюз пісьменнікаў Беларусі і часопіс Беларускага саюза жанчын, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Выдавецкага дома «Звязда» «Алеся».

На конкурс прымаюцца творы малых паэтычных жанраў (верш, санет і г. д.) і малых празаічных жанрах (апавяданне, абразок, казка, эсэ), якія нідзе раней не друкаваліся.

У конкурсе «Вы — пачатак прыгажосці, вы — жыцця першапрычына» прымаюць удзел паўналетнія чытачы і падпісчыкі часопіса «Алеся». Мовы — беларуская і руская.

Вынікі падводзяцца ў дзвюх намінацыях — «Найлепшы паэтычны твор» (1-е, 2-е, 3-е месца) і «Найлепшы празаічны твор» (1-е, 2-е, 3-е месца). Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны падпіскай на часопіс «Алеся» на 1-е паўгоддзе 2023 года, а творы-пераможцы апублікаваны на яго старонках.

Падрабязнасці на сайце *www.zviazda.by* і ў кастрычніцкім нумары часопіса «Алеся».

Сяргей ШЫЧКО

радзіннае

На роднай мове

7 кастрычніка ў сталічным дзіцячым садку № 563 заняткі па роднай мове прайшлі разам з дзіцячай пісьменніцай Інай Фраловой. Хлопчыкі і дзяўчынкі адказвалі на пытанні Іны Мікалаеўны, разважалі, якога стаўлення да сябе патрабуюць кніжкі, адгадвалі загадкі, весяліліся і гулялі. У аўтарскім выкананні гучалі вершы з новай кнігі пісьменніцы «Вясковыя вакацыі». Аўтар расказала пра іншыя свае кнігі. Няўрымслівы Вожык, вясёлыя Зайчаняткі, Гусяняткі-маракі і іншыя героі вельмі спадабаліся маленькім аматарам слова.

Напрыканцы сустрэчы пры дапамозе старэйшых выхаванцы дзіцячага садка прыйшлі да высновы: сябраваць з кніжкай вельмі цікава.

Сустрэча адбылася па ініцыятыве загадчыка публічнай бібліятэкі № 21 Раісы Граблюк, якая таксама прыняла ўдзел у мерапрыемстве.

Ганна СТАРАДУБ

«ЛіМ»-люстэрка

Устамбульскім Універсітэце Айдын адкрылася выстаўка, прымеркаваная да 140-годдзя класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Генеральны консул Беларусі ў Турцыі Аляксей Швед у сваім выступленні звярнуў увагу на значэнне творчасці беларускіх літаратараў для развіцця нацыянальнай культуры. Ён адзначыў агульны інтарэс Беларусі і Турцыі ва ўзаемаўзбагачэнні праз культуру, цытуе БелТА словы генеральнага консула. Бібліятэцы Універсітэта Айдын былі перададзены ў дар выданні ад Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Беларускі саюз дызайнераў распачаў серыю кінапраглядаў у межах праекта «Стужка14». Асветніцкая ініцыятыва маладой генерацыі саюза «Стужка14» прапануе паглядзець на дызайн з новага ракурсу. Сезон 2022—2023 складаецца з 14 эпізодаў і ўтрымлівае мастацкія і дакументальныя стужкі: розныя гады, розныя тэмы, розная глыбіня тэмы. Агульнае адно — панаванне дызайну. Кожная сустрэча складаецца з двух дубляў: 1. Прагляд; 2. Абмеркаванне. Кінапрагляды будуць адбывацца ў галерэі Беларускага саюза дызайнераў двойчы на месяц.

Узаемныя гастролі Магілёўскага і Смаленскага абласных тэатраў лялек адбудуцца 22—23 кастрычніка. Так, Магілёўскі абласны тэатр лялек прадставіць на смаленскай сцэне танцавальную казку «Муха-Цакатуха» і гісторыю «Прыгоды Джэка Вераб'я». У сваю чаргу, смаленскія лялечнікі пакажуць на беларускай сцэне два спектаклі для дзяцей — «Сястрыца Алёнушка і братка Іванушка» і «Мыйдадзір», якія рэалізаваны пры падтрымцы расійскага федэральнага праекта «Культура малой радзімы», паведамляецца на сайце Магілёўскага абласнога тэатра лялек.

Музей гісторыі і культуры Наваполацка запрашае наведаць новую выстаўку філатэліі і філакартыі «Флора і фаўна» з фондаў музея. Экспанаты збіраліся з 1970-х да 2018 года. Прадстаўленыя на выстаўцы маркі былі перададзены ў фонды музея з прыватных калекцый. Гэтыя экспанаты паказваюць флору і фаўну не толькі Беларусі, але і іншых краін. Маркі расказваюць аб багатым раслінным і жывёльным свеце Манголіі, Балгарыі, В'етнама, Кубы. Таксама ў калекцыі знакі паштовай аплаты абмежаванага тыражу з адлюстраваннем выкапнёвых жывёл, паведамляе БелТА. Пазнаёміцца з прыкладамі філатэліі і філакартыі можна да 10 лістапада.

Скончыўся візіт генеральнага дырэктара Вялікага тэатра Беларусі Кацярыны Дулавай у Астану. Адбыліся перагаворы з кіраўніцтвам Дзяржаўнага тэатра оперы і балета «Астана Опера» — дырэктарам тэатра Галымам Ахмед'яравым і намеснікам дырэктара Айжан Курмангаліевай, паведамляецца ў тэлеграм-канале Опернага тэатра Беларусі. Падпісаны мемарандум аб двухбаковым супрацоўніцтве, які прадугледжвае арганізацыю і правядзенне гастроляў салістаў і калектываў тэатраў, удзел у конкурсах і фестывалях. Чакаецца, што ўжо ў снежні 2022 года калектыў тэатра «Астана Опера» прыме ўдзел у Мінскім міжнародным Калядным оперным форуме. У найбліжэйшы час салісты Вялікага тэатра Беларусі выступяць у Астане ў пастаноўках «Яўген Анегін» і «Дон Кіхот».

Экспазіцыю «Трагедыя народаў» прадставіць Маскоўскі Музей Перамогі ў Беларускім культурным цэнтры духоўнага адраджэння. Мультымедыйны выставачны праект прысвечаны памяці савецкіх грамадзян, якія пацярпелі ад нацысцкай агрэсіі і акупацыйнай палітыкі, былі закатаваны ў гета і канцлагерах, выгнаны на прымусовыя работы ў Германію і сумежныя краіны. Наведвальнікі ўбачаць больш за 100 алічбаваных друкаваных рарытэтаў з фондаў Музея Перамогі, паведамілі БелТА ў прэс-службе музея. Выстаўка арганізоўваецца ў рамках міжнароднага праекта «Тэрыторыя Перамогі», накіраванага на стварэнне адзінай прасторы па ваеннай гісторыі XX стагоддзя.

Беларус Павел Козін атрымаў Гран-пры на Міжнародным конкурсе моды «Адмиралтейская игла» у Санкт-Пецярбургу. Фестываль моды, мастацтва і дызайну праходзіў з 5 да 9 кастрычніка. Арганізатар мерапрыемства — Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт прамысловых тэхналогій і дызайну. Упершыню ў гісторыі конкурсу маладых дызайнераў уладальнікам Гран-пры і сертыфіката на 500 000 расійскіх рублёў стаў удзельнік з Беларусі Павел Козін, навучэнец Баранавіцкага дзяржаўнага каледжа тэхналогій і дызайну. Малады дызайнер ужо стаў пераможцам фестывалю-конкурсу «Млын моды 2022». Міжнароднае журы з Расіі, Італіі, Казахстана і Беларусі палічыла калекцыю Паўла Козіна «Бібліяклазм» найлепшай сярод 500 конкурсных заявак.

Цікавінкі ад Валянціна САЛОМЫ

Іншага не дадзена

Фота Кастуся Дробава.

Сусветна вядомы пісьменнік і лётчык Антуан дэ Сент-Экзюперы неяк заўважыў: «Быць чалавекам — гэта адчуваць сваю адказнасць». Тым больш правільнае гэтае сведчанне ў дачыненні да сапраўднага пісьменніка, чыёй творчасці адчуванне адказнасці перад часам і людзьмі надае той глыбінны сэнс, праяўленне якога магчыма толькі тады, калі з'яднаны талент, выразная гуманістычная і грамадзянская пазіцыя. Акурат гэтым і цікавы народны пісьменнік Беларусі Мікалай Чаргінец, у якога, праўда, слава не такая шырокая, як у Антуана дэ Сент-Экзюперы, але творцам многіх краін застаецца толькі пазайздросціць яго вядомасці. За разнапланавыя дасягненні ў галіне культуры і навукі Мікалай Іванавіч занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Кембрыджскім бібліяграфічным цэнтрам за выдатны ўклад у міжнародныя адносіны, а таксама за значны ўнёсак у мастацкую літаратуру яму прысвоена званне «Міжнародны прафесіянал 2005 года». У 2008 годзе Амерыканскі бібліяграфічны інстытут назваў яго «Чалавекам года».

Згадаць жа ўсе званні, узнагароды, атрыманыя «дома» і ў блізкім замежжы, месца не хопіць. Іначай быць і не можа, бо іншага не дадзена. Талент абавязвае. А ў прыдачу здзіўляльная працаздольнасць. Не толькі творчая, але і арганізатарская. Мікалай Іванавіч — выдатны дзяржаўны і грамадскі дзеяч, генерал-лейтэнант унутраных войск. Удзельнік Афганскай вайны. І аўтар больш чым пяцідзесяці раманаў, шмат якія перакладзены і на іншыя мовы.

Падтрыманы Васілём Быкавым

Паколькі доўгі час працаваў у міліцыі, пачаў з тэмы, яму блізкай. І першая кніга «Чацвёрты след», і наступныя «Трывожная служба» і «Следства працягваецца» дакументальныя ў сваёй аснове. Асноўны іх герой — супрацоўнік крымінальнага вышуку капітан Ігар Ветраў. Ён «перайшоў» і ў аповесць «Фінал Краба», аднак у чарговым званні. Часопісны варыянт твора — «Здагадка маёра Ветрава». Гэта класічны дэтэктыў, але адначасова глыбока псіхалагічны, што і адрознівала яго ад дэтэктываў-аднадзёнак. Згаданая аповесць таму і стала значнай вяхой у мастакоўскай біяграфіі Мікалая Іванавіча, што ён пачаў упэўнена адыходзіць ад дакументальнай асновы. Як у дылогіі, што складаецца з раманаў «Вам — заданне» і «За секунду да выстралу».

На першы з іх у рэцэнзіі «Навука перамагаць», змешчанай у «Литературной газете», звярнуў увагу Васіль Быкаў: «Это многоплановое произведение, по-видимому, задумывалось автором как традиционный семейный роман — с обстоятельным и неторопливым исследованием характеров в их семейных и бытовых сцеплениях, как это и принято в современной и классической литературе, имеющей немало великолепных примеров такого рода». Быкава-крытыка дапаўняў Быкаў-празаік, які ведаў, адштурхоўваючыся не толькі ад вопыту сучаснай літаратуры, але і з уласнай творчай практыкі, што час прынёс адчувальныя змены нават у такі, здавалася б, непахісны асяродак, як той, які трымаецца на сваяцкіх адносінах, таму далей развіваў сваю думку такім чынам: «Но известно, что в наш XX век с его отличительными от предыдущих времен, порой лихорадочными и сумбурными, ритмами жизни семейные рамки тесны и недостаточны. И уж они совершенно не в состоянии выдержать напора тех бурных страстей и ошеломляющих событий, которыми изобиловала минувшая война». Зыходзячы з гэтага, Васіль Уладзіміравіч разумеў, якую цяжкую задачу паставіў перад сабой аўтар. Аднак вітаў яго памкненні, бо паспеў пераканацца, наколькі маштабная задума ўжо адпавядала свайму адэкватнаму ўвасабленню.

Афганістан без прыхарошвання

Не мог Мікалай Іванавіч не звярнуцца і да падзей Афганскай вайны. Абодва раманы — «Тайна Чорных гор» і «Сыны» — надзвычай праўдзівыя і памастацку дасканалыя. Тым не менш у другім з іх больш глыбокае пранікненне ў падзеі, непасрэдным удзельнікам якіх быў. Куды больш пранікліва расказваецца, як тое, што адбывалася ў гэтай краіне, адгукнулася ў лёсе савецкіх людзей. Пісьменнік пастаянна праводзіць паралель з мірнай рэчаіснасцю. Ёсць у рамане і праўда, якая доўгі час замоўчвалася. Толькі праз замежныя «галасы» прасочвалася інфармацыя пра тое, што на адной з найбуйнейшых ваенных баз, дзе ўтрымліваліся савецкія ваеннапалонныя і афганцы, якіх таксама напаткала няволя, адбылося паўстанне.

Старонкі аб пакістанскім палоне ў жанравых адносінах прымыкаюць да палітычнага рамана. Аўтар расказвае пра тых, хто нават у самых жорсткіх умовах не зламаўся. Адначасова ён выкрывае тых барацьбітоў за «дэмакратыю», якія прывыклі дзейнічаць, прыкрываючыся двайнымі стандартамі. Па сутнасці, абагнаў час, закрануўшы праблему, на якую літаратура яшчэ не звяртала ўвагі. Тым самым стаў першапраходцам. Дарэчы, пасля гэтага ў падобнай ролі выступае неаднаразова, ускрываючы заганы буржуазнага грамадства ў самых розных іх праяўленнях.

Усе гэтыя заакіянскія дабрадзеі накшталт амерыканца Роберта, англійскага лорда Нікаласа Бетэла, амерыканскай разведчыцы Людмілы Торн, якая праходзіць пад сваім прозвішчам у ролі перакладчыцы, і іншыя нічым не адрозніваюцца ад тых, хто з цяпер спрабуе прымусіць увесь свет жыць па ўласным узоры. Аднак карта ўсіх гэтых паноў біта. Савецкіх салдат, як і іх аднагодкаў, на мякіне не правядзеш. Сярод іх не знайшлося тых, каму захацелася б пакаштаваць даброты замежнай цывілізацыі, у першую чаргу амерыканскай. У нечалавечых умовах яны не толькі выжылі, але і, знайшоўшы агульную мову, паднялі паўстанне.

Раман «Сыны», як і многія іншыя кнігі Чаргінца, неаднойчы перавыдаваўся (гэта пры тым, што першы наклад яго, як і «Тайны Чорных гор», быў для Беларусі агромністы — 180 тысяч асобнікаў). Гэта сведчыць аб запатрабаванасці твора. І яшчэ не менш прыемны факт. У 1989 годзе (ён быў і годам выхаду «Сыноў» у выдавецтве «Мастацкая літаратура») аддзел сацыялогіі Дзяржаўнай кніжнай палаты БССР прапанаваў чытачам спіс усіх 140 мастацкіх і дакументальна-мастацкіх кніг, што выйшлі тады ў краіне. Пасля аналізу 1503 атрыманых анкет ЭВМ паставіла «Сыноў» на трэцяе месца. Першай была названа кніга «Знак бяды. Раман. Кар'ер. Аповесць» Васіля Быкава, а другой — «Хатынская аповесць. Публіцыстыка» Алеся Адамовіча. Што ж, чытач аддае перавагу сапраўднай літаратуры. Дарэчы, годам раней кніга Чаргінца «Загад № 1» у выніку правядзення такога ж апытання заняла другое месца. Пасля «Аповесцей» Быкава. Сам жа Мікалай Іванавіч сваім любімым творам лічыць дылогію «За секунду да выстралу» і раман «Сыны».

Калі не першы ты, ды хто ж тады

Ужо нават з разгледжаных твораў добра відаць, наколькі шматгранная творчасць Мікалая Чаргінца, як настойліва, мэтанакіравана і паспяхова асвойвае ён самыя розныя тэмы, робячы гэта па-свойму, правільным будзе сказаць, па-чаргінцоўску. Калі ж дадаць яшчэ раманы, што засталіся па-за межамі гэтага аналізу, то атрымаецца аб'ёмны літаратурны мацярык, густа населены самымі рознымі персанажамі. За імі — жыццё, якое простым не было, ды і ніколі не будзе. Задача ж пісьменніка, як вядома, і заключаецца ў тым, каб, праўдзіва ўзнаўляючы яго, працаваць як бы на апярэджанне, празорлівасцю свайго таленту нават прадугадаць тое, што магчыма. Тут трэба ўмела арыентавацца ў сучасных падзеях, падыходзячы да іх у глабальным разрэзе.

Менавіта гэтага ён дасягнуў у рамане «Ілоты вар'яцтва» яшчэ за шэсць гадоў да трагедыі, што адбылася ў Нью-Ёрку, калі былі ўзарваны хмарачосы. Сілай свайго таленту папярэдзіў чалавецтва аб пагрозе, што нясе міжнародны тэрарызм. Раманам жа «Тайна Авальнага кабінета» таксама выказаў занепакоенасць тым, як складзецца далейшы лёс планеты, у жыццё якой усё больш умешваюцца жыхары таго дома, у якім няма нічога святога, нормай паўсядзённага жыцця стала амаральнасць. І ў абодвух выпадках засведчыў: калі за пэўную тэму не бяруцца іншыя, асвятляй яе сам. Асабліва калі ўпэўнены, што справішся.

Свой перад часам і людзьмі

Мікалай Чаргінец — з тых пісьменнікаў, пра каго можна сказаць: яму гады — паўбяды. Па-ранейшаму піша гэтак сама плённа, як і ў час сваёй мастакоўскай маладосці, а аддача такая, якой і многім празаікам-маладзёнам застаецца пазайздросціць. Ды яшчэ што ні твор — абавязкова сваё слова. У гэтым, у прыватнасці, пераконвае раман «Аперацыя "Кроў"», дзе апавядаецца пра дзіцячыя лагеры ў вёсцы Сёмкава пад Мінскам, у якіх у хлопчыкаў і дзяўчынак забіралі кроў для лячэння нямецкіх салдат і афіцэраў. Ніхто да Мікалая Чаргінца так падрабязна не пісаў і пра тое, што адбывалася ў Мінскім гета, пра генацыд, якому падвяргаліся ні ў чым не вінаватыя людзі. У рамане пераканаўча паказана, што ў яўрэйскай крыві і тыя, каго сёння ёсць ахвотныя абяліць. Напрыклад, гаўляйтар Кубэ.

Нічога падобнага на раман «Аперацыя "Кроў"» у нашай літаратуры раней не было. Для гэтага мала вялікага таленту. Трэба ўсё прапусціць праз сябе. Так зрабіць, каб яно стала часткай і цябе самога, а лёс тых, каго ўзнавіў, ператварыўся ў часцінку тваёй унутранай біяграфіі, становячыся ўжо і тваім болем. Твор гэты пры ўсёй сваёй высокай мастацкай вартасці валодае і не менш важнай якасцю: гэта — кніга-ўчынак пісьменніка, які сам добра ведае, што такое мужнасць і гераізм, не трывае подласці і здрады.

Такая яго грамадзянская і пісьменніцкая пазіцыя і ў рамане «А ён не вярнуўся з бою» — своеасаблівым працягу «Тайны Чорных гор» і «Сыноў». Спачатку хацеў дадаць да «Сыноў» раздзел пра капітана Бровікава, для якога ўдзел у Афганскай вайне стаў часткай выпрабаванняў, наканаваных яму лёсам. Але паступова выкрышталізавалася задума новага рамана. Настолькі вострасюжэтнага, што не адарвацца.

Галоўны літаратурны герой Бровікаў, страціўшы нагу, не толькі ўцякае з душманскага палону, але і трапляе ў Егіпет, пасля — на алмазныя прыскі ў Зімбабвэ. Яшчэ пазней палюе на львоў, пасябраваў з туземцамі. Увайшоў у давер да кіраўнікоў адной з аўтарытэтных кампаній. Толькі сюжэт сюжэтам, але не менш важна, а ў нечым і больш, наколькі ўсё гэта пададзена псіхалагічна дакладна і вывераца. Хоць чаму здзіўляцца: сапраўдны майстар заўсёды застаецца майстрам. І мяжы дасканаласці няма, калі глыбінны талент, асновы якога закладзены ў маладыя гады, у больш чым сталым узросце шліфуецца так, што немагчымае становіцца магчымым. Выяўляецца гэта не толькі ў той тытанічнай актыўнасці Мікалая Іванавіча, пра якую ўжо гаварылася, а ў жаданні падзяліцца з чытачом пражытым і перажытым. Гэтым напоўнена і яшчэ адна новая кніга, якая неўзабаве выйдзе ў Выдавецкім доме «Звязда».

* * *

Ёсць у Мікалая Чаргінца і тое, што ніякімі дакументамі не пацвярджаецца. Ды ў іх і неабходнасці няма. Гэтая якасць найлепшым з найлепшых надаецца самім Усявышнім. А Гасподзь, як найвялікшы празорца ў Сусвеце, і надзяліў ёю і Мікалая Іванавіча. Ён — найсумленнейшы чалавек, а такія людзі, быццам вялікі магніт, прыцягваюць да сябе і многіх, хто таксама трапляе пад гэтакае вызначэнне. Таму чаргінцоўскае атачэнне — такія выдатныя людзі, як народныя пісьменнікі Беларусі Васіль Быкаў, Андрэй Макаёнак, Іван Шамякін, Іван Чыгрынаў… Нібы маці, была для яго Ганна Цімафееўна Гагарына, якая ўспрымала яго ледзь не родным сынам. Стасункі з Быкавым склаліся настолькі прыязнымі, сяброўскімі, што Васіль Уладзіміравіч пры ўсёй сваёй занятасці знаходзіў час, каб пісаць калегу ў Афганістан, а ў друку ахвотна адгукаўся на яго творы.

У пэўнай ступені гэта і тое, што, пераўвасабляючы па-беларуску неўміручыя радкі Міхаіла Лермантава, яшчэ адзін волат нацыянальнага прыгожага пісьменства Аркадзь Куляшоў перадаў настолькі непаўторна, нібы так і ў арыгінале: «<…> зорка зорцы голас падае». Літаратурная зорка Мікалая Чаргінца таксама займае годнае месца ў багатым пісьменніцкім сузор'і беларускай літаратуры. Яго творы, хоць і напісаны па-руску, напоўнены духам беларускім. Чытаючы кнігі гэтага выдатнага нашага сучасніка, атрымліваеш той зарад аптымізму і бадзёрасці, пасля якога яшчэ больш хочацца жыць. Тым больш разам з ім.

З 85-годдзем, дарагі Мікалай Іванавіч!

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Космас Янкі Купалы

Чым больш вывучаюць айчынныя і замежныя літаратуразнаўцы творчасць беларускіх класікаў, тым часцей сутыкаюцца з пэўнымі лакунамі, загадкамі, малавядомымі фактамі ў жыцці і дзейнасці вядомых пісьменнікаў — пашыраецца так званая мяжа няведання: там, дзе ўсё лічылася даўно даследаваным і зразумелым, дзе няма, здавалася б, месца адкрыццям, раптам узнікаюць пэўныя знаходкі, далягляды новых росшукаў і версій. Не з'яўляецца тут выключэннем і нацыянальны геній Янка Купала, пра што ішла гаворка на прэзентацыі нумара часопіса «Роднае слова», прымеркаванага да 140-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі.

Літаратурна-музычная імпрэза адбылася ў музеі Янкі Купалы. Ганаровымі гасцямі мерапрыемства сталі многія аўтары, чые публікацыі пабачылі свет пад вокладкай прэзентаванага нумара.

Як зазначыла ў прывітальным слове галоўны рэдактар «Роднага слова» Наталля Шапран, змест выдання з'яўляецца плёнам супрацоўніцтва рэдакцыі з літаратура-, мова- і мастацтвазнаўцамі, педагогамі, бібліёграфамі, архівістамі, культуролагамі. Тэма даследавання творчасці песняра для часопіса не новая. Матэрыялы, прысвечаныя Янку Купалу, друкуюцца ў выданні рэгулярна — сучаснае купалазнаўства на старонках часопіса ўжо можа стаць аб'ектам навуковай увагі.

— Гэта не проста зборнік навуковых даследаванняў — для аматараў выдання было сабрана самае актуальнае і цікавае, што ёсць у сучаснай гуманітарыстыцы. Рэдакцыя імкнулася ўвасобіць шырыню панарамы і маштаб сучаснага купалазнаўства, інтарэсаў нашых навукоўцаў і даследаванняў, — падзялілася галоўны рэдактар. — Мы паспрабавалі прадэманстраваць, што ва

Фота Кастуся Дробава.

Наталля Шапран.

ўсіх сферах айчыннай гуманітарыстыкі, і найперш тых, што адлюстроўваюцца на старонках «Роднага слова» як ВАКаўскага выдання, ёсць месца для глыбокага асэнсавання жыцця і творчасці класіка, а таксама прадставіць наша бачанне вобраза Янкі Купалы і стаўленне да яго даследчыкаў.

Так, кожнае пакаленне: і чытачы, і даследчыкі — адкрываюць нацыянальнага генія наноў, таму вектарная скіраванасць з мінулага ў сучаснасць (што і падкрэслена ў назве імпрэзы — «Янка Купала: з XX стагоддзя ў XXI») — гэта не толькі пра паэта, якога працягваюць чытаць і вывучаць, але і пра якасць і адметнасць купалазнаўства, — і кожны можа пераканацца ў гэтым, пагартаўшы старонкі выдання.

Юбілейная нагода — 140-годдзе песняра — надала творчы імпульс незвычайным навуковым росшукам, падштурхнула да неканачнічых ракурсаў, паспрыяла новай інтэрпрэтацыі творчасці паэта і спробе класіфікаваць ужо зробленае. «Купалаўскі» нумар «Роднага слова» адразу ж стаў бібліяграфічнай рэдкасцю. Своеасаблівым падарункам у фонды Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, па словах Н. Шапран, будзе нумар часопіса з аўтографамі даследчыкаў, чые публікацыі пабачылі свет пад яго вокладкай. А што да месца сустрэчы, то і яно атрымалася сімвалічным: прэзентаваны нумар — вынік партнёрскага праекта — рыхтаваўся ў творчай супрацы з кулектывам установы. У зале музея экспануецца выстаўка, прымеркаваная да стагоддзя першай кнігі Янкі Купалы, якая выйшла ў Беларусі, — зборніка «Спадчына».

Прагучала падчас мерапрыемства і падзяка рэдакцыйнаму калектыву часопіса «Роднае слова», а таксама персанальна галоўнаму рэдактару за ўдзел у сумесных творчых праектах, за ўнёсак у захаванне гістарычнай памяці, папулярызацыю айчыннай культурнай спадчыны і патрыятычнае выхаванне, што выказала дырэктар музея Янкі Купалы Ганна Галіноўская.

Падарункам прысутным было і музычнае аздабленне вечара: у выкананні Народнага ансамбля цымбалістаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта «Вярба» пад кіраўніцтвам Вольгі Андрыенкі прагучалі творы, натхнёныя жыццём і творчасцю айчыннага класіка.

Таша ШПАКОЎСКАЯ

Знаходкі і далягляды

Тэма Янкі Купалы праходзіць як магістральная праз усе традыцыйныя раздзелы часопіса. Сярод аўтараў публікацый ёсць і вядомыя купалазнаўцы, і тыя, хто звярнуўся да тэмы генія айчыннай літаратуры ўпершыню, спарадычна, што ні ў якай меры не робіць іх даследаванні менш цікавымі ці змястоўнымі.

Так, надзвычай арыгінальная ідэя належыць Сяргею Шапрану, тэмай росшукаў якога стала хатняя бібліятэка песняра — артыкул «Беларуская Атлантыда, або Спроба віртуальнай рэканструкцыі кніжніцы Янкі Купалы напярэдадні лета 1941 года» расцягнуўся на два нумары часопіса. Асноўная праблема, датычная спроб аднавіць напаўненне бібліятэкі паэта, палягае ў тым, што яна згарэла падчас вайны. Тым не менш даследчык упершыню ў гісторыі купалазнаўства назваў лічбу асобнікаў, якія ўтрымлівала кніжніца Песняра, — гэта дваццаць тысяч адзінак. Прычым семсот з іх удалося ідэнтыфікаваць, звярнуўшыся да сведчанняў, у тым ліку пісьмовых, тых людзей, якія былі знаёмы з паэтам, абменьваліся з ім кнігамі, вялі перапіску. Аўтар, які, дарэчы, не будучы купалазнаўцам, але з'яўляючыся вядучым рубрыкі на старонках выдання, паўстае як апантаны даследчык пісьменніцкіх хатніх бібліятэк.

Цікавы і арыгінальны артыкул Настассі Трафімчык, супрацоўніцы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. У даследаванні пад назвай «Ён — Купала…» аўтарка звярнулася да вобраза народнага паэта, выяўленага на жывапісных палотнах з фондасховішча ўстановы. У музеі біяграфія і тыя асобы, якія істотна паўплывалі на лёсавызначэнне і светапогляд творцы, прадстаўлены досыць шырока партрэтамі і сюжэтнымі карцінамі — гэта і паслужыла нагодай для публікацыі. Так, на палотнах можна пабачыць Янку Купалу побач з паплечнікамі, сярод якіх Цётка, Браніслаў Тарашкевіч, Якуб Колас, Паўліна Мядзёлка, Кузьма Чорны. Фотавыявы пад вокладкай часопіса пераважна з фондаў Купалаўскага музея.

Артыкул Веранікі Ермалінскай, доктара мастацтвазнаўства, «"Мне сняцца сны аб Беларусі": Янка Купала і беларускі тэатр» з'яўляецца спробай акрэсліць ролю нацыянальнага генія ў гісторыі нашага тэатра.

Вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Людміла Сільнова распавядае пра рэдкае выданне паэта ў фондах галоўнай кніжніцы краіны. Кандыдат мастацтвазнаўства Лідзія Шкор у артыкуле «"Хлопчык і лётчык" Янкі Купалы як пошук "чалавека будучыні" даследуе «адарваныя ад зямлі» вобразы, створаныя Янкам Купалам, праводзячы вобразна-сімвалічныя паралелі з Маленькім прынцам Антуана дэ Сент-Экзюперы і балетам Яўгена Глебава, пастаўленым спачатку ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры Расіі (1983), а потым — на сцэне Вялікага тэатра Беларусі (2015).

Прапанаваныя ў рубрыцы «Калі закончыўся ўрок» да ўвагі настаўнікаў агульнаадукацыйных школ інтэрактыўныя заняткі па творчасці беларускага класіка (матэрыялы Вольгі Івановай і Юліі Лапавухавай «Явар і каліна: паэт і яго муза: Літаратурна-музычная кампазіцыя (IX—XI класы)» і Марыны Петрашкевіч «Зайграем у "Жалейку": Гульня па паэтычным зборніку "Жалейка" Янкі Купалы») могуць паспяхова праводзіцца не толькі ў навучальных установах, але і ў бібліятэках і музеях краіны: гульнёва-захапляльная форма падачы неабходнай для засвоення інфармацыі — найлепшы сродак прывіць дзецям любоў да мовы і літаратуры, а таксама творчасці айчынных класікаў.

Арыгінальным і адным з найцікавейшых артыкулаў у нумары з'яўляецца даследаванне Міколы Труса «Зборнік Янкі Купалы "Жалейка" (1908): архіўнамедыйны і літаратурна-крытычны дыскурсы», змешчанае ў рубрыцы «Літаратура і час». Вучоны прапанаваў на аснове першакрыніц, архіўных матэрыялаў новы погляд на дэбютную кнігу класіка беларускай літаратуры. У праекцыі на кнігавыдавецкую практыку і медыйныя традыцыі пачатку XX ст. М. Трус зрабіў спробу актуалізаваць праблемнае поле літаратуразнаўчых даследаванняў, выкарыстаўшы магчымасці гістарычнай рэканструкцыі. Варта заўважыць, што М. Трус — аўтар публікацый на гэтыя тэмы і ў «ЛіМе». Наколькі яму ўдалося актуалізаваць асобны напрамак даследавання, звязаны з гісторыяй выдання, выдавецка-паліграфічнага выканання, рэцэпцыяй «Жалейкі» Янкі Купалы, вырашаць чытачу. Але несумненна, што па выніках працы ў архівах даследчык здолеў выявіць шэраг эпізодаў, не асветленых ранейшымі літаратуразнаўцамі або абмінутымі іх увагай: былі знойдзены не толькі некаторыя факты, датычныя выдання, але і тэксты, пазначаны праблемныя палі. Мікола Трус звяртае ўвагу, што ні адзін беларускі архіў сёння не мае першакрыніц усіх рэцэнзій на «Жалейку», гэтае ж тычыцца і першага зборніка Якуба Коласа — такім чынам даследчык абазначае напрамак будучых росшукаў у літаратуразнаўстве і гісторыі літаратуры.

Да адной з найменш даследаваных тэм у айчынным літаратуразнаўстве звяртаецца вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Павел Каралёў у артыкуле «Гумар Янкі Купалы». Зазвычай такія тэмы, як жарты і гумарэскі, лічацца другаснымі і несур'ёзнымі ў творчасці «сур'ёзных» геніяў, аднак нашага класіка



Фота Кастуся Дробава.

немагчыма ўявіць без яго ўмення тонка, далікатна, незласліва пажартаваць, без яго непераўзыдзенай іскрамётнай іроніі. П. Каралёў прасачыў гумар Купалы ў розных яго творах: гэта п'еса «Паўлінка», сцэнічны жарт «Прымакі», «Тутэйшыя» (трагічна-смяшлівых сцэнах у 4-х дзеях, як пазначыў сам аўтар), вершах «Паэзія», «На ўсе рукі» і інш. Сучаснікі творцы адзначалі яго выдатнае пачуццё гумару: ён мог засмяяцца «громко, задорно» (згадваў пісьменнік Канстанцін Цітоў). «Заўсёды жартаўлівы», казаў пра яго паэт Мікола Хведаровіч. Драматург Рыгор Кобец згадваў сумесную рыбалку з Купалам: «Смех его был каким-то заразительно-весёлым, детским. Шутки и остроты его были полны юмора, очень смешные, но никогда никому не обидные». Пісьменнік Міхась Машара прыгадваў: «Многія ведаюць, што Купала валодаў пачуццём гумару, любіў тонкую іронію, умеў дасціпна жартаваць». Цяжка меркаваць, ці стаў бы Купала такім, якім мы яго любім, без гэтай выдатнай уласцівасці характару — схільнасці бачыць і адчуваць ноткі іроніі ў паўсядзённым жыцці… Такім чынам, тэма гумару — адна з найцікавейшых, якая яшчэ чакае і даследчыкаў.

Сталі аўтарамі даследавання і іншыя супрацоўнікі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Загадчык аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы ўстановы Марыя Барткова ў артыкуле «Над ціхай Вязынкай-ракой…» да 50-годдзя Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка «Вязынка» распавядае пра цікавыя малавядомыя факты з гісторыі стварэння філіяла.

Галоўны захавальнік фондаў музея Надзея Саевіч у даследаванні «Фоталетапіс жыцця» звяртае ўвагу, як камплектаваліся калекцыі фатаграфій Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Не пакінуць абыякавымі аматараў айчыннай літаратуры артыкулы Ганны Запартыкі, Алеся Бельскага, Віктара Жыбуля, Мікіты Картамышава, Веранікі Курцовай і іншых даследчыкаў, чые матэрыялы можна знайсці пад вокладкай юбілейнага нумара часопіса.

Таша ШПАКОЎСКАЯ

Гомельшчына творчая

Чарговы выпуск альманаха «Літаратурная Гомельшчына», што днямі пабачыў свет у КПУП «Калор», прысвечаны знакаваму святу — Дню беларускага пісьменства, якое сёлета адбылося ў Добрушы.

— Улічваючы колькасць і важнасць матэрыялаў, па тэме мы зрабілі аб'яднаны выпуск — № 19 і 20, — падзяліўся галоўны рэдактар і ўкладальнік альманаха, старшыня абласнога аддзялення СПБ, празаік, публіцыст і драматург Уладзімір Гаўрыловіч. — Уключылі творы членаў Гомельскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», а таксама маладых аўтараў і аматараў мастацкай творчасці, прысвечаныя Году гістарычнай памяці, Году класічнай літаратуры і чытання на Гомельшчыне, старажытнаму Добрушу — сталіцы XXIX Дня беларускага пісьменства ў 2022 годзе.

Альманах, які быў заснаваны ў 2007-м, з году ў год удасканальваецца, напаўняецца змястоўнымі, цікавымі творамі, што карыстаюцца попытам у чытачоў бібліятэк не толькі Гомельскай вобласці, але і іншых рэгіёнаў нашай краіны і замежжа. У новым выпуску альманаха асвятляецца пісьменніцкае жыццё вобласці за мінулы год («Рэха пісьменніцкага жыцця Гомельшчыны»). А літаратурнае жыццё тут вірує: у 2021 годзе прайшлі творчыя форумы: XVI Міжнародны фестываль-свята «Славянскія літаратурныя дажынкі», III рэгіянальны фестываль літаратуры, культуры, мастацтва і народных традыцый «На зямлі Кірылы Тураўскага» з удзелам майстроў слова трох славянскіх краін і V Форум маладых літаратараў і аматараў мастацкай творчасці «Слова».

Пад рубрыкай «Добруш — душы бясцэнны скарб» змешчаны творы фіналістаў абласнога літаратурнага конкурсу, прысвечанага сталіцы XXIX Дня беларускага пісьменства, — Міколы Ждановіча, Леаніда Севера, Галіны Рагавой, Тамары Кручэнкі, Ніны Шкляравай, Алы Бяльковай, Дар'і Дарошкі, Генадзя Говара, Людмілы Яськовай, Веры Стасенкі, Ганны Атрошчанкі, Лідзіі Возісавай, Алега Ананьева і Ірыны Чайковай.

Многія літаратары Гомельшчыны прысвяцілі творы Году гістарычнай памяці. Чытачы не застануцца абыякавымі да ўрыўка з рамана Уладзіміра Гаўрыловіча «Па веры вашай…», апавяданняў Валянціны Кадзетавай-Арэставай «Я ёй не дарую», Ганны Атрошчанкі «Вандроўка ў Добруш», прозы Дар'і Дарошкі, Тамары Кручэнкі, Вольгі Раўчанкі, Іны Спасібінай, Раісы Дзейкун, вершаў Соф'і Шах, Ізяслава Катлярова, Тамары Кручэнкі, Лілліі Вялічкі, Міхася Болсуна, Івана Цітарэнкі, Ніны Шкляравай, Лідзіі Долбікавай, Галіны Рагавой.

Ёсць у альманаху і дэбютанты. Гэта члены СПБ — вядомы вучоны і публіцыст, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат шматлікіх прэмій і конкурсаў Юрый Плескачэўскі і галоўны рэдактар шматтыражкі

«Сельмашавец» Мікалай Дзямчыхін. Першы з іх выступіў з артыкулам «Беларусь: от лозунга к формуле жизни и далее к национальной идее», другі — з нізкай апавяданняў. Матэрыялы гэтыя змешчаны пад рубрыкай «Да Радзімы з любоўю і верай».

У раздзелах «Зямля і людзі. Час і лёс» апублікаваны творы паэткі Вольгі Астапенкі і празаікаў Аляксандра Джада і Міхася Слівы, у раздзеле «Жыццё пражыць — не поле перайсці» выступілі публіцысты, паэты і празаікі Міхаіл Дзедавец, Наталля Канопліч, Алег Ананнеў, Яўген Калашнікаў, Ева Дударга, Іна Зарэцкая, Вера Квяткоўская, Ала Бялькова.

Раздзел «Чалавек і навакольны свет» прадстаўляюць празаікі Надзея Дзмітрыева і Таццяна Маісеева.

Парадавалі творамі паэты Людміла Яськова, Валерый Вятошкін, Аляксандр Каляда, Наталля Шамяткова, Аляксандр Белік, Алена Матвіенка, празаік Аляксандр Алейнік (раздзел «…Дзе чакаюць родныя крыніцы»).

Асобна трэба спыніцца на раздзеле «Літаратурная публіцыстыка. Крытыка» — тут змешчаны вельмі цікавыя і змястоўныя развагі знакамітага пісьменніка і публіцыста, лаўрэата Дзяржаўнай і Нацыянальнай літаратурнай прэмій Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Саламахі. Піша ён пра творчасць паэтаў Уладзіміра Шпадарука і Соф'і Шах. Выказваецца эмацыянальна, творчасць гэтых неардынарных беларускіх паэтаў аналізуе зацікаўлена, грунтоўна. А «Пісьменнік года — 2021» Вольга Раўчанка разглядае кнігу калмыцкай пісьменніцы Таццяны Бадаковай «По кругу солнца», якая выйшла ў Германіі.

Знайшлося месца ў выданні і для падборкі паэтычных спроб пяра маладых літаратараў Гомельшчыны, і для твораў членаў народнага літаратурна-паэтычнага клуба «Натхненне», які працуе пры Добрушскай цэнтральнай раённай бібліятэцы пад кіраўніцтвам члена СПБ Людмілы Яськовай.

Міхась СЛІВА

Чорнае на белым

Кніга Аляксандра Чубарава «Огнь поядающий» наўрад ці патрапіць у рукі да звычайнага чытача. Мінімалістычны чорна-белы зборнік выдадзены тыражом усяго 50 экзэмпляраў.

Аўтар закранае ў сваіх вершах тэмы, што на працягу вякоў хвалявалі не адно пакаленні творцаў: Сусвет, Бог, космас, Радзіма, праўда. Глыбокі, магчыма, недасяжна глыбокі сэнс закладзены ўжо ў назве кнігі «Огнь поядающий». «Бог есть огнь поядаяй», — сказана ў пасланні апостала Паўла да яўрэяў.

Калі звярнуцца да тлумачэння радка, які хваляваў шматлікіх вядомых царкоўных дзеячаў, то «Огнь поядающий» і ёсць Бог. Калі штосьці жывое дакранаецца да агню, то змяняецца: альбо згарае, альбо гартуецца. Тое ж самае адбываецца і з чалавекам, калі той дакранаецца да Бога: альбо гіне, альбо ратуецца. Неаднаразова ў Бібліі ды іншых рэлігійных кнігах вобраз Бога перадаецца праз сілу агню. Усе хрысціянскія вернікі добра знаёмы з аповедам аб Неапальнай Купіне.

Вершы кароткія, часам падаецца, што нават няскончаныя. Аднак гэта аўтар робіць наўмысна, каб пакінуць чытачу прастору для ўласных роздумаў. Аляксандр Чубараў у ролі асцярожнага настаўніка падводзіць да пэўнай думкі, якая яму асабіста ўжо адкрылася. Гэтым ён і імкнецца падзяліцца.

Добра дэманструе гэта наступны верш: «Жизнь — не повод для горя, // Особенно после дождя. // После смерти — тем более // Далее…» А далей думаць чытачу.

Асобныя старонкі змяшчаюць вершы, што больш падобныя на занатаваныя думкі, якія прыйшлі падчас працы. Выразна гэта адлюстроўваюць радкі: «Поэзия… зия…ия … // И я — зия… // Поэзия — // Зиянье…»

Ёсць у кнізе і моманты, з якімі цяжка пагадзіцца. Прыкладам можа стаць верш пад гучнай назвай «О демократии». Аўтар тлумачыць падзеі выгнання Адама і Евы з Эдэма як няўдалую спробу дэмакратыі і прапануе чытачу самастойна падумаць над высновай. Дазволім сабе не згадзіцца з падобным трактаваннем рэлігійнага тэксту. Адам і Ева ад пачатку згадзіліся з тым, што ім забаронена зрываць плады з Дрэва пазнання. То-бок, прынялі гэтую забарону, а пасля таемна парушылі яе, такім чынам здзейсніўшы злачынства, за якое і былі пакараны.

Валянцін САЛОМА

Пра Алега Лойку

і беларускую літаратуру ў кантэксце сусветнай

Нядаўна пабачыў свет вялікі том (427 старонак), у якім прадстаўлены матэрыялы ўдзельнікаў XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай», што адбылася летась на філалагічным факультэце БДУ.

У кнігу ўвайшлі матэрыялы, прысвечаныя 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нараджэння члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара Алега Лойкі (1931—2008).

Не ўсе ўдзельнікі змаглі летась прысутнічаць на навуковай сустрэчы, але даклады іх выступленняў на самыя разнастайныя тэмы сабраны пад адной вокладкай. У гэтых артыкулах асветлены актуальныя пытанні тэорыі, гісторыі і паэтыкі літаратуры, кампаратывістыкі, літаратурных сувязей і кантактаў, мастацкага перакладу, нацыянальнага і сусветнага літаратурнага працэсу, сучаснай паэзіі і прозы, развіцця жанраў і стыляў, літаратурнай і моўнай адукацыі і іншыя.

Прадмову напісаў дэкан філалагічнага факультэта БДУ Сяргей Важнік, які адзначыў: «Мы памятаем кожнага, хто стаяў каля вытокаў станаўлення ўніверсітэта і айчыннай філалогіі. І вельмі правільна, што ў час такіх вялікіх юбілеяў успамінаюцца асобы, якія будавалі ўніверсітэт "на месцах". Адным з такіх стваральнікаў быў і застаецца колішні дэкан факультэта Алег Антонавіч Лойка — тонкі і руплівы педагог, таленавіты паэт, грунтоўны навуковец, чалавек, з лёгкай рукі якога на літаратурнае крыло сталі шматлікія беларускія паэты…»

Кніга распачынаецца матэрыяламі пра Алега Лойку. З цікавасцю можна прачытаць пра пасіянарнасць прафесара, пра яго — вучонага і паэта, пра ролю ўніверсітэцкага літаб'яднання «Узлёт» у творчым станаўленні маладых паэтаў, пра экспромты Алега Лойкі і пра мінскую тэму ў яго паэзіі, а таксама дзясяткі іншых даследаванняў, звязаных з творчасцю Алега Лойкі.

Другі раздзел прысвечаны сучаснай літаратуры і аспектам кампаратывістыкі, трэці — айчыннай літаратуры XX стагоддзя, чацвёрты —літаратуры Беларусі і суседніх краін на мяжы XX—XXI стагоддзяў, пяты — тэорыі, мове, дыдактыцы, літаратуры і мастацтву.

Навуковым рэдактарам кнігі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай» з'яўляецца доктар філалагічных навук, прафесар Алесь Бельскі. Першы асобнік кнігі паступіў ужо ў Слонімскую раённую бібліятэку імя Якуба Коласа для музея-пакоя Алега Лойкі.

Сяргей ЧЫГРЫН

Пошукі душы

Уладзімір Шугля — аўтар паэтычных зборнікаў на беларускай і рускай мовах, член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Ганаровы Генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Расіі. Яго вершы публікаваліся ў часопісах «Наш современник», «Молодая гвардия», «Нёман», «Невский альманах» і інш.

У апошні зборнік паэта «Закатов поздних собеседник» увайшлі яго найлепшыя вершы розных перыядаў творчасці. Кніга лірыкі выйшла ў 2022 годзе ў «Курганскай гарадской друкарні». Зборнік складаецца з двух раздзелаў «Пад сэрца шатамі» (2019—2021 гг.) і «Па старонках друкаваных выданняў», якія таксама дзеляцца на главы.

Вершы У. Шуглі — гэта не сучасныя мадэрнісцкія эксперыменты, абарваныя з'едлівыя фразы і вострыя вуглы. Хутчэй наадварот: яго творчасць па стылі больш асацыіруецца з вершамі рускіх класікаў: Пушкіна, Ясеніна і Лермантава, а да твораў апошняга ў ёй можна знайсці прамыя спасылкі:

В сознанье — рваные туманы…
И жажда…Пить…
И отчий кров,
Как белый парус в океане
Несёт живой воды любовь.

Вобраз ветразя выкарыстоўваецца не адзін раз, але, зразумела, у творах знаёмым здаецца не толькі ён. Руская вёска, прастор, воля, любоў, апалае лісце, белая тройка — гэтыя вобразы вядомы ўсім яшчэ са школы. Кожнаму з іх знаходзіцца месца і ў творах Шуглі. Аднак маляўнічая пейзажная лірыка не адзіны складнік яго вершаў. У іх таксама можна знайсці ўспаміны пра юнацтва і яго памылкі, лёгкі смутак, які пераходзіць у невыносную горыч, «думкі-пчолы і думкі-птушкі», надакучлівую бессань і ўспаміны пра родных і блізкіх. Нават калі чытач не знаёмы з асобай аўтара, ён усё роўна можа вызначыць, што гэтыя вершы напісаў не юны паэт, а ўжо дарослы мужчына, які пражыў доўгае жыццё:

Я старею не годами,
А потерями родных,
Не услышать голос мамин,
Голоса сестер моих.

А гэтыя пачуцці блізкія многім людзям, бо звычайна смерць родных здаецца нам значна больш страшнай, чым наша ўласная... Аднак у аўтара ўсё ж такі засталіся іншыя родныя людзі: сын, унук і дачка. Ім ён і прысвячае верш, які можна супрацьпаставіць папярэдняму. Там была памяць, туга, а тут рэальнасць і ўсведамленне таго, што ты патрэбны сваім дзецям. Дапамагчы парадай, адказаць на пытанне, падбадзёрыць або падзяліцца важным жыццёвым вопытам.

Выкарыстоўвае У. Шугля ў сваіх вершах і рэлігійныя матывы. Бог, храм, грахі згадваюцца ў многіх яго творах. Але тэмай яго лірыкі яшчэ часцей становяцца душэўныя пошукі. Душа паэта імкнецца ўвысь,у бязмежнае сіняе неба, за аблокі.

Разважае аўтар і на іншыя філасофскія тэмы. Задаецца пытаннем, што такое каханне, і сам на яго адказвае. Ён пералічвае розныя яго іпастасі, але спыняецца на той, якая бліжэй за ўсё. Для яго каханне

не запал, хвароба або безразважнасць. Ён выбірае яе больш светлы, спакойны, летуценны бок, бачыць у ёй гаючую гармонію.

У цэлым паэзія Уладзіміра Шуглі лёгкая для ўспрымання. Калі вы любіце класічную рускую паэзію, то і зборнік «Заходаў позніх суразмоўца» вам спадабаецца.

Валерыя ГАЎРУКОВІЧ

У скарбніцу айчыннага прыгожага пісьменства

Гісторыя падарыла нам колькі вялікіх твораў, без якіх нельга ўявіць сусветную культуру, — помнікі чалавечай думкі, што сталі не толькі нацыянальнымі шэдэўрамі, але і здабыткам усяго чалавецтва. І гонарам для кожнай краіны з'яўляецца магчымасць знаёміцца з імі на сваёй мове. Часта такой справай займаюцца буйныя інстытуцыі, бо работа гэта складаная і энергаёмістая, але бывае так, што за яе бяруцца рупліўцы, якія лічаць унутраным абавязкам спрычыніцца да такой важнай задачы.

Ужо колькі гадоў у гэтым кірунку плённа працуе перакладчык Ігар Кулікоў. Менавіта дзякуючы яму мы маем магчымасць прачытаць па-беларуску «Рыгведу. Кола I», «Аповед пра Шакунталу», «Воблачны вястун» Калідасы, а зараз і выбраныя аповеды з першага вялікага эпасу Індыі «Магабгарата».

Перакладчык да справы сваёй падыходзіць з акадэмічнай грунтоўнасцю, у чым можна пераканацца пазнаёміўшыся з уводзінамі, дзе Ігар Кулікоў на 67 старонках тэксту знаёміць нас з гісторыяй «Магабгараты», паэтычнымі памерамі, у якіх выкананы твор, і асаблівасцю перадачы іх на беларускай мове, а таксама спыняецца на асаблівасцях перакладу эпічнай паэзіі.

Варта зазначыць, што Ігар Кулікоў абазнаны не толькі ў санскрыце, але і ў стараанглійскай, старайсландскай і стараславянскай мовах. Добрае веданне старажытных эпасаў, а таксама рэтраспектыўны погляд на развіццё беларускай мовы дазволілі падысці да перакладу з адпаведным інструментарыем, прыстасаваным для пастаўленай задачы.

Калі чытаеш пераклад, узнікае адчуванне, што на беларускую мову ён быў перастворaны не зараз, а ў пару старажытных багоў і эпічных тэкстаў, якіх так не стае беларускай літаратуры, з лексікай высокага стылю і такім нязвыклым, але інтуітыўна блізкім словаўтварэннем.

З першых *шлокаў (двухрадкоўяў, якімі напісана Магабгарата)* перад намі разгортваецца вялікі тэкст індыйскай культуры, а праз пэўную архаізацыю мовы беларускай ствараецца арганічная атмасфера прысутнасці ў тых далёкіх часах, калі быў напісаны твор:

Аповед пра Паўш'ю
Частка 3

13. Падышоў да Сомашраваса, Джанамэджая, сын Парыкшытаў, вырашыў ўзяць яго за ачольніка.

14. Пакланіўшыся таму рышы, ён прамовіў: «Багавіты, хай твой сын будзе маім ачольнікам!»

15. Пачуўшы гэта, той адказаў: «О Княжа, мой сын нарадзіўся ад змяі. Вялікі жарбіт і бездакорны вучань, ён быў зачаты сілаю маёй жарбы і вырас у чэраве той змяі, што выпіла майго семені. Ён зможа суняць любы ўчынены табою грэх, акрамя злачынства супраць Вялік-бога. Аднак мой сын даў адзін таемны зарок: калі які-небудзь брагман што-небудзь у яго папросіць, то ён яму тое і аддасць. Калі гэта не пужае цябе, то бяры яго!».

Вось як тлумачыць свой падыход да працы сам Ігар Кулікоў: «…дадзеная кніга — гэта перадусім паэтычнае перастварэнне, і, працуючы над ёй, перакладчык бачыў сваёй галоўнай задачай стварыць падобны да санскрыцкага паэтычны тэкст, які б гучаў так, нібыта МБ [«Магабгарата» — заўвага аўтара] была ад пачатку складзена на беларускай мове. Гэтым абумоўлена і імкненне захаваць зыходныя паэтычныя памеры, і перакладанне некаторых санскрыцкіх слоў, якія звычайна пакідаюць у транслітарацыі, і пэўная вольнасць у абыходжанні з формуламі і формульнымі выразамі, якія ў беларускім варыянце далёка не заўжды знаходзяцца там, дзе ў выточным тэксце».

І сапраўды, калі чытаеш пераклад, узнікае адчуванне, што на беларускую мову ён быў перастворaны не зараз, а ў пару старажытных багоў і эпічных тэкстаў, якіх так не стае беларускай літаратуры, з лексікай высокага стылю і такім нязвыклым, але інтуітыўна блізкім словаўтварэннем.

Аповед пра рыбу
Частка 185

2. «Быў Вівасватаў сын Ману, велярышы магутлівы, Прародзічу равён бліскам, о найлепшы між бгаратаў.
3. Магутою, жарбой, палам і красою Вайвасвата перавысіў свайго дзеда, а таксама свайго айца.
4. Узняўшы ўгару рукі, на адной назе стоячы, у слыннай ён у Бадары суворую чыніў жарбу».

Зразумела, што падобны тэкст не можа абысціся без навуковага каментарыя. І сапраўды, ледзь не пад кожнай старонкай вы знойдзеце інфармацыю пра згаданых у творы асоб і тлумачэнні паняццяў, калі яны не прыведзены ў тлумачальным слоўніку напрыканцы выдання.

Ігар Кулікоў абазнаны не толькі ў санскрыце, але і ў стараанглійскай, старайсландскай і стараславянскай мовах. Добрае веданне старажытных эпасаў, а таксама рэтраспектыўны погляд на развіццё беларускай мовы дазволілі падысці да перакладу з адпаведным інструментарыем, прыстасаваным для пастаўленай задачы.

Тэкст «Магабгараты» мае свой сюжэт, але для яго поўнага раскрыцця, нават праз урыўкі, не кажучы пра ўвесь аб'ём, давялося б укладаць адразу некалькі важкіх тамоў, таму перакладчык гэтым разам сканцэнтраваў сваю ўвагу на найцікавейшых устаўных аповедах, якія прадставілі знакаміты эпас праз сваю жанравую разнастайнасць і шматлікія пабочныя гісторыі. Асноўны сюжэт не застаўся без увагі, так, у кнізе ён прадстаўлены праз «Аповед пра горца» і «Плач Гандгары», але ў слове «Ад перакладчыка» Ігар Кулікоў удакладняе: «...з гэтага зборніка чытач амаль нічога не даведаецца пра асноўныя падзеі МБ (калі толькі не прачытае «Кароткі зьмест» ва ўступе), але затое пазнаёміцца з міфалогіяй і рэлігійна-этычнымі поглядамі тагачаснай Індыі, а такама з яе старажытнай паэзіяй».

«Магабгарата» — чытво не на кожны дзень. Як і любы вялікі твор, ён вымагае часу і ўвагі, і я шчыра раю выдаткаваць іх для таго, каб пазнаёміцца з гэтым літаратурным помнікам, каб адчуць веліч старажытнаіндыйскай культуры і фенаменальную пластычнасць беларускай мовы. І першае, і другое прынясуць вам сапраўдныя адкрыцці і эстэтычна-інтэлектуальную асалоду.

Хочацца падзякаваць Ігару Кулікову за праведзеную працу, бо менавіта такія кнігі ў будучыні будуць уваходзіць у новыя акадэмічныя серыі літаратурных помнікаў па-беларуску, без якой ніводная нацыя не можа сябе лічыць сапраўды далучанай да скарбонкі сусветнай культуры.

Міхаіл БАРАНОЎСКІ

Па кроплі лета смакавалі…

Пісьменніцкая справа — рэч індывідуальная. Пра гэта ведае кожны, хто ёй займаецца. Але лірыка — адна з адметных рыс творчасці ўсіх пісьменнікаў Міншчыны. Яна ўвабрала ў сябе найлепшыя традыцыі беларускай і рускай культур. Нездарма зусім нядаўна мы на працягу тыдня праводзілі мерапрыемствы «Дарогамі Максіма Танка» па ўшанаванні памяці і святкаванні 110-гадовага юбілею слыннага зямляка, сапраўднага патрыёта сваёй малой радзімы, народнага паэта Беларусі Яўгена Іванавіча Скурко. А яшчэ высокая планка мілагучнасці, здавалася б, самых празаічных і «суровых» тэм і розных літаратурных жанраў, у якіх працуюць пісьменнікі, была зададзена першым старшынёй нашай абласной арганізацыі, ветэранам вайны ў Афганістане, заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь паэтам Рыгорам Сакалоўскім. Вось, напрыклад, адзін з яго вершаў пра перажытае: «Будет жить во мне война до последнего дыханья… // Я ещё не раз с заданья возвращусь, лишившись сна. // Я ещё не раз с тобой по неписаным законам, // губы сжав, без слов, без стона овладею высотой. // Я ещё не раз, мой друг, на простреленном «Тюльпане» // над Кабулом утром ранним совершу печальный круг. // Всё сплелось: и ордена, и ружейный залп прощальный… // До последнего дыханья будет жить во мне война!»

Сёння ў Мінскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі крыху больш за восемдзесят паэтаў, празаікаў, публіцыстаў. Яны рознага ўзросту і прафесій, жывуць у розных куточках цэнтральнага рэгіёна краіны. Яднае іх любоў да радзімы і роднага слова. Яны пішуць сакавітыя ў літаратурным сэнсе творы. На жаль, у гэтай публікацыі прадстаўлены толькі кроплі літаратурных лірычных выкшталцонасцей. Яны прысвечаны жыццесцвярджальнай палітры фарбаў лета. Чытайце, смакуйце іх разам з аўтарамі!

Леанід КРЫВАНОС,
старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі

Лёля БАГДАНОВІЧ
г. Барысаў

У зорных начоўках...

Жнівень гартае тыдні, хвіліны,
Яблык наспеліў — гнуцца галіны.
Падаюць долу, нельга ўтрымацца,
Дзе ж тых падпорак столькі
набрацца...

Гарачынёю добра ў цянёчку.
У зорных начоўках песціцца ночка.
Кропу суквецці ў пацерках росаў
Гушкае ветрык проставалосы.

Жнівеньскі дождж сыпане
стрымгалоў —
Выскачыць процьма розных грыбоў.
Шчодрае лета на падарункі
Сыдзе, сабраўшы ўсе свае клункі.

Восень падмане летняй спакусай.
Над сенажаццю кружыцца бусел.
Быццам малітву шэпчуць бярозы
Сноў каляровых шэрую прозу...

Тамара БЯРЭЗІНА
г. Маладзечна

Бура

З-за лесу цёмнаю навалай
Паўзла махіна цяжкай хмары.
Яна паўнеба закрывала,
Расла, пужаючы абшары.
У чорна-сінім грозным целе
Агнём барвовым бліскавіцы
Усё бліжэй, бліжэй мігцелі —
Грамоў аддаленых сястрыцы.
Ужо ўсё неба захінула,
Абвальны дождж нясе з сабою,
А дождж і град з магутным шумам
Няўмольна сунецца сцяною.
Іх падганяе моцны вецер —
Не ведае стыхія стомы,
Зрывае вецер дрэваў вецце,
І дрэвы ломяцца раптоўна.
Град секануў пякучым шротам,
Ліецца дождж з нябёс лавінай,
Сячэ расліны, нібы дротам, —
На градах месіва пакінуў.
Нядоўга бушавала бура —
Далей пасунулася хмара,
Пранеслася з дажджом віхура
Злой, небяспечнаю пачварай.
Ужо сціхае вецер дзікі,
Дождж рэдкім робіцца і слабне,
На лужынах — ад сонца блікі:
Яно ўжо засвяціла ўладна.

Фёдар ГУРЫНОВІЧ
г. Салігорск

Рака дзяцінства

У плыткай рэчцы плёскалася лета.
Вада была празрыстай, як сляза.
Прамень выслізгваў, ранкам абагрэты,
З аеравага вузкага ляза.
Плёс высланы быў сінімі шаўкамі.
Гарлачыкі пабліскваллі расой.
Лянотна шавялілі плаўнікамі
Сярэбраныя зліткі карасёў.

Рабін надрэчных глянцавыя гронкі
Ужо нясмела сталі ружавець.
Быў я ўлюбёны ў гэты жнівень звонкі
І ў рэчку, абмялелую на трэць.

Яна ўздыхала неяк па-дзіцячы,
Хавала сарамлівы свой пагляд,
Як быццам знала, што інакшай бачыў
Яе я шэсцьдзясят гадоў назад.

Наталля ЖЫЗНЕЎСКАЯ
Валожынскі раён

Дзіўнае лета

Вітае нас дзіўнае лета,
Карціны малюе свае.
Цудоўная стужка сюжэту,
Уражанні ў думках сатчэ.

Птушыныя звонкія спевы,
Запоўняць прастору вакол.
Праменьчыкі сонца ў пасевах,
Над імі — нібы арэол.

Пахучае сена на лузе
З дажджом незнаёма зусім.
Расой закранутае ўнізе,
Удзень ужо будзе сухім.

Заблытаўся ў косах бярозак
Гарэзлівы вецер-блуднік.
Засеяла ноч жменяй зорак
Бясконца нябесны квятнік.

Такое вось дзіўнае лета,
Ды з'яваў усіх не злічыць.
Пяшчотаю сонца сагрэта,
І нельга яго не любіць.

Віктар КАЖУРА
г. Вілейка

Ліпень

Ліпень пахучы, але даручы.
З народнага

Ранак сонечна-вясёлы —
Загудзелі ў ліпах пчолы,
Так шчыруюць, так лятаюць,
Залацісты мёд збіраюць.
Ліпень вас яшчэ пакліча
У чарніцы і ў суніцы,
У салодкія маліны,
Чарнабокія ажыны.
Завядзе на сховы-сцежкі,
Дзе прыціхлі сыраежкі.
Ды загляне пад сукі,
Дзе сядзяць баравікі…
Ліпень шчодры на дарункі,
На гасцінцы-падарункі.
Толькі Ліпню будзь удзячны,
Пакланіся — ён аддзячыць.

Фота Кастуся Дробава.

Жнівень

Жнівень сее, жне і косіць —
на стале багацця ўдосталь.
З народнага

Залаты дыван на ніве —
Аж гараць палі,
Працаўнік старанны Жнівень
Крочыць па зямлі.
Жоўта-спелае прыволле
Хіліць колас да зямлі,
На ўмалотнае раздолле
Зноў камбайны паплылі.
Ураджай наўздзіў багаты
Не марудзь жа, а збірай!..
Першы сноп… Дажынкі… Свята…
Шчодры каравай…

Таццяна КАЛЕНІК
г. Мінск

Чаму кацянят становіцца меней?

Ці бачылі вы,
як жнівеньскія яблыкі
свецяць цяжарным зоркам?
…Таму і хіляцца голлем да самай зямлі
яблыні,
трымаюць вагу наліўных ліхтароў,
пакуль шукаюць прытулак
пад іхнімі шатамі
зорныя прыхадні.

Ці чулі вы,
як падаюць зоркі ў ваш сад?
Як, адарваўшыся ад галінак,
стомлена падаюць побач
іх пуцяводныя агеньчыкі - яблыкі?
Аб чым жа шэпчуцца яны
падчас вокамгненнага спаткання,
ці чулі вы?
Ці бачылі...
як нараджаюцца зорныя немаўляты?
Як дагарае маці-звязда?
Як на плач асірацелых нованароджаных
спяшаюцца спагадлівыя коткі?

…Не спыняецца жыццё нябесных дзетак
пад кашлатымі чэравамі
тутэйшых матуль!
Галубяць яны малых
цёплымі языкамі,
падсілкоўваюць моцай зямных таямніц
і не ведаюць,
што зноў і зноў
расквечваюць сувоі
міжпланетнага бязмежжа
зорным зззяннем,
што запальваюць і запальваюць
ураджай духмяных ліхтароў
у вашым садзе.
Багіні жыцця…

Як спыніць ім цябе, чалавек,
каб незнарок, у пагоні за прыгажосцю
ўласнага існавання,
не спыніў ты
бясконцы кругаварот жыцця?

Леанід КРЫВАНОС
г. Мінск

* * *

Родныя нівы,
Колас наліты.
Дожджыкам шчодра
Палеткі паліты.

Поўніцца зерне
Пад промнямі сонца, —
Жыта, нібы
Разлілося бясконца.

Хвалі ад ветру
У моры жытнёвым.
Вабіць яно
Ураджаем нас новым.

Выйдзе ў поле
Эскадра камбайнаў.
Збожжа збіраць
Будуць плённа і дбайна.

Будучы хлеб
Змалаціць дапаможа
Міласць надвор'я,
Упартасць і Божа.

Галіна НІЧЫПАРОВІЧ

Уздзенскі раён

Бывай, лета

Адзвінела лета жаўрукамі,
Пеставала сонейкам даволі.
Пралілося на зямлю дажджамі,
Адцвіло валошкамі у полі.

Громам пракацілася ў нябёсах,
У лесе прарасло яно грыбамі,
Палягло травою у пракосах,
Гойдаецца спелымі хлябамі.

Лета на выходзе. Неба просінь
Праразае жураўліны клін,
А насустрач лету
крочыць восень,
Палымнее чырванню рабін.

Галіна НУПРЭЙЧЫК

г. Клецк

Яблынька

Цёмна-зялёныя сосны высокія
Сонца скупое злавілі, рассеялі.
Стужкаю ўецца дарога шырокая
І пакідае абшары Карэліі.

Раптам пагляд прыпыняецца, цешыцца.
Сэрца сагрэла пяшчотнымі промнямі
Райская яблынька! Яблыкі свецяцца,
Шчочкамі йграюць ружова-пунсовымі.

Подых Радзімы, усмешка лагодная.
Край бела-русы. Вяртанне жаданае,
Як на мяжы тая яблынька родная:
Светлая, шчодрая, Богам пасланая.

Шыпшына

На ўскрайку лесу ружавее,
Цвіце шыпшына,
Ды непрыступная як фея,
Або дзяўчына.

Паглядам коле рук імклівых
Няўмелы дотык.
Затым падорыць сарамліва
Букет пяшчоты.

Вольга САВАСЦЮК

г. Мар'іна Горка

На выходзе лета

Старэе лета. Жнівень на абшарах
Ужо раскінуў суму ручнікі.
Плывуць у небе згорбленыя хмары,
Чарнее сінь няўрымслівай ракі.
На пожні бусел талаку збірае —
Наперадзе такі нялёгкі шлях…
Бо ўжо так блізка восень маладая
Нясе нам свой чырвона-жоўты сцяг.

* * *

Сінечу п'е вясёлка з ручая,
Смакуе асцярожна, каб не ўпіцца.
Пад закаханы пошчак салаўя
Ракіце малады вятрыска сніцца.

Палошча сонца промні ў вадзе,
Сваім цяплом пазалаціла хвалі.
Ты бачыш, лета па зямлі ідзе?
Ты чуеш — лета? Мы яго чакалі.

Каб захмялець ад кветак у лугах,
Ад прахалоды векавога бору,
Каб зноў не спаць і марыць па начах
Аб тым, што не прыйшло да нас учора.

Эльвіра ЯРЧАК

Мінскі раён

У Вязынцы на Купалле

Вецер сумна шуміць, не пяе,
Разганяючы гора-нуду,
Пра шляхі і дарогі мае,
Па якіх я ўжо не прайду,
Каб купальскія зёлкі сабраць,
Каб унукаў сваіх прывітаць.
Ды вясёлым Купалавым днём
Мы з дзяўчатамі песні спяём,
Пасядзім ля ягонай ракі,
Як няўдачнікі рыбакі.

Фота Кастуся Дробава.

Будуць яблынькі ў рэчку глядзець,
Будзе неба над намі сінець,
І бясконцы зялёны абшар
Нам падорыць Купала-пясняр.
Тут Анёл сваім светлым крылом
Закрануў той святы вадаём,
Ля якога Ян-хлопчык стаяў
І з матуляю песні спяваў.
І панесліся песні ў свет:
Нарадзіўся Купала-паэт.

Таццяна ЦВІРКА

г. Клецк

Смак ліпеня

Каменьчык, цюкнуўшы у шыбу,
Даў знак — сустрэчу святкаваць.
Нясмела ты мяне паклікаў
Па кроплі ліпень смакаваць.
Збіралі зёлак пах ля рэчкі,
З рамонкаў мералі вянкі,
І елі спелыя парэчкі —
О, што за цуд жа смак такі!
Пасля бязглуздай нашай спрэчкі
Ад крыўды слёз мне не стрымаць…
Якія кіслыя парэчкі!
Ну проста нельга ў рот узяць.

У Купальскую ноч

Смяецца поўня зубам пазалочаным,
Кладзецца на начлег
пад вербай дзень —
Суцішаны, натруджаны, находжаны.
А за руку змрок ноч ужо вядзе.
Стракочуць конікі на лузе
разнаколерным,
У купал-стог склікаючы сяброў.
Крынічка калыханку задаволена
Спявае для тутэйшых жыхароў.
Зрывае ноч гарлачыкі пахучыя,
Ступае басанож,
каб не спужаць
Купальскіх зор.
Бо сёння ім даручана
За кветкай шчасця пільна цікаваць.

Генадзь АЎЛАСЕНКА

г. Чэрвень

Кветкі — кахання сведкі…

Кветкі — кахання сведкі…
І божа вас барані
Дарыць без кахання кветкі
У святы ці ў буднія дні!

Тады ўжо лепш — дыяменты,
Духі, шакалад, віно.
Дарыце хоць…
кампліменты,
Для кветак жа — толькі адно…

Бо кветкі — кахання сведкі,
Яго святыя агні!
Дарыце каханым кветкі
І ў святы, і ў буднія дні!

Па іншай якой прычыне
Вы іх не рвіце дарма…

Навошта кветкі жанчыне,
Калі кахання няма?!

Рагнед МАЛАХОЎСКІ

г. Мінск

Кахання радок

Мінаюць ночы і сыходзяць дні…
Абдымкі маленства сціскаюць душу…
Ценем затуманенага саду…
Леапардавыя клёны
Кахання радок
Палёты ў вышынях пачуццяў
За межамі свядомасці і тлену…
Студзеньскімі узорамі…
Глыток ахалоджанай колы…
Сцяжыны кахання
Дыяментавым россыпам слоў...
Я вярнуўся з чужынных мясцін...
У праменні зорнай цішыні...
Песімістыка
Я памятаю лета...
Шлях да цябе
На ўскрайку атлантычнага цыклону…

Мінаюць ночы і сыходзяць дні…
Чаму не беражэш таго, што маеш?
Юнацтва засыхаюць карані,
Калі каханне першае губляеш.
І нават не задумаўся, чаму
Дзяўчынка тая позірк свой хавае…
А ты, як злодзей, маску нацягнуў
У пошуку душы, што пакахае.
Рамантык гіне. Вір жыцця круты...
Імклівага кахання пульс радзее.
Ды па-над прорвай хочаш верыць ты:
Былы адчай абернецца надзеяй...
Змяняюцца шляхі і гарады...
Сысці б на таямнічым тым прыпынку,
Дзе сціпла, праз шалёныя гады,
З мінулага ўсміхаецца дзяўчынка.
Абдымкі маленства сціскаюць душу…
На ўзлеску жадана сарвецца ажына.
Вярніся! Вярніся! Адчайна прашу.
І босыя ногі пазнае сцяжына…
Сустрэнемся там, дзе блукае жыццё,
Дзе лёгкасцю дзіўнай напоўняцца грудзі,
Дзе ззяннем вясны маладзее лісцё,
Дзе штосьці было, і чагосьці не будзе.
І стане блакітным сівы далягляд,
І «снегам» пухнатым вітаюць таполі…
Няхай на імгненне — сустрэўся пагляд,
Што ў сэрцы жыве,
што не вернеш ніколі.

Ганна МІКЛАШЭВІЧ

г. Слуцк

* * *

Хінецца да тваёй мая душа,
З цяплом і шчасцем развітацца цяжка…
Чужыя і далёкія спярша,
А сёння клад пачуццяў поўны, важкі…

І мы насустрач свету і агню…
Не дай жа, Божа, апаліць нам крылы…
Я праспяваю шчыра, не зманю,
Што гэты свет мне без цябе не мілы,

Што твой сусвет
і мой сусвет — адно,
Без пачуцця не жыць мне і без ласкі,
Я п'ю жыццё, як хмельнае віно,
І веру ў прынца з чарадзейнай казкі…

Зіновій ПРЫГОДЗІЧ

г. Мінск

Спатканне

Я так даўно цябе чакаў!..
Ішоў праз завірухі і туманы,
Але нідзе не сустракаў
Я той, каго б назваў каханай.

Я так даўно цябе шукаў
Па сцежках, бальшаках, гасцінцах...
Але нідзе не напаткаў
Я той, каго б назваў адзінай.

Я вобраз твой у мроях ткаў
З рэальнага і незямнога.
Цярпліва верыў і чакаў
Я тую, што даецца Богам.

І раптам —
як вясёлка ў ваччу,
І плынь святла жывога...
Смяюся я, і плачу, і шапчу:
«Нарэшце ты прыйшла...
Каханая!..
Адзіная!..
Ад Бога...»

Віктар САБАЛЕЎСКІ

г. Узда

Лірычны настрой

За далямі далёкімі,
За сінімі аблокамі,
За рэчкамі-узорамі,
Зялёнымі прасторамі
Ля возера прыгожага
І берага мурожнага
З бялюткімі туманамі
Жыве мая каханая.

Ёй раніца ўсміхаецца,
З ёй сонца абдымаецца,
І ветрык з ёй цалуецца,
І радуецца вуліца,
Калі хадой няспешнаю
Насустрач пані-вечнасці
Далёкая, жаданая
Ідзе мая каханая.

Спакоем вочы свецяцца,
Над імі — два паўмесяцы,
І дзве шчакі — сунічкамі,
І валасы пшанічныя,
І шыйка лебядзіная —
Цудоўная, адзіная,
Ні з кім не параўнальная,
Жыві, мая каханая!

Паклон Пташнікаву

Калі трымаў гэтыя лісты ў руках пасля шостага-сёмага перачытання, выпадкова ўспомнілася кніга, лічы, забытага ці па сённяшнім часе не вельмі вядомага рускага пісьменніка Уладзіміра Лідзіна «Людзі і сустрэчы». Выдадзеная ў 1961 годзе, яна складаецца з асобных нарысаў пра сустрэчы аўтара са старэйшымі пісьменнікамі. Мяне ўразілі не нарысы пра Максіма Горкага і Аляксея Талстога. Уразілі тэксты пра малавядомых ці да прачытання кнігі Лідзіна зусім невядомых празаікаў. Наколькі ўважлівыя былі яны да зробленага ў літаратуры равеснікамі ці наступнікамі, больш маладымі аўтарамі!

Гэта ўжо, пэўна, не вернецца — здольнасць своечасова сказаць добрае слова. Вось і ў кнізе нашай беларускай пісьменніцы Алены Васілевіч «Люблю, хвалююся — жыву» сутыкнуўся з тым, як хораша, не здраджваючы ісціне, яна гаворыць пра здзейсненае нашмат маладзейшымі калегамі… І нават калі заўважае істотныя агрэхі, усё ж завяршае такім вось добрым словам ці нечым падобным: «Мне хацелася толькі выказаць сваю радасць: у нашай літаратуры з'явіўся новы твор, пра які неабходна гаварыць як пра значную падзею. З'явіўся яшчэ адзін вельмі здольны пісьменнік. І гэта таксама павінна ўсіх нас радаваць».

27 снежня 1967 года Васіль Быкаў піша з Гродна Івану Пташнікаву:

«Дарагі Іване!

Хачу паціснуць табе руку за "Тартак", безумоўна, самае лепшае з усяго, што ты напісаў. Хораша, глыбока, чэсна, дабротна. Праўдзівыя вобразы, багатая мова, маса падрабязнасцей — усё прываблівае ў аповесці. Мне думаецца, што з усіх нас, хто піша, ты найбліжэйшы да К. Чорнага.

Пачэсная сцежка, браце.

Па-добраму зайздрошчу і віншую.

Са шчырасцю Васіль Б.

І яшчэ — з Новым, 1968-м!».

У друку Васіль Уладзіміравіч ці неаднойчы толькі выказаўся пра Івана Пташнікава. Чытаем у газеце «Літаратура і мастацтва» ад 7 сакавіка 1975 года ў артыкуле «Агульнымі намаганнямі»: «…Нягледзячы на тое, што многае з ваеннай тэмы было грунтоўна адпрацавана пералічанымі вышэй і многімі іншымі, не названымі тут аўтарамі, тым не менш яна дасюль не заходзіць са старонак перыёдыкі і працягвае радаваць новымі адкрыццямі болей маладых: Івана Чыгрынава, Івана Пташнікава, Барыса Сачанкі, а таксама рускіх празаікаў рэспублікі — Мікалая Аляксеева, Мікалая Кругавых, Валянціна Тараса. Зразумела, гэта — розныя па свайму таленту аўтары, якія напісалі розныя па літаратурных вартасцях кнігі аб розных чалавечых лёсах, але ўсім ім уласціва галоўная якасць — вернасць праўдзе вялікай вайны, якая з'явілася крывавым выпрабаваннем у жыцці народа і ўсяго чалавецтва».

«Тартак» — аповесць, асновай сюжэту якой паслужыў трагічны ваенны лёс лагойскай вёскі Дальва, спаленай фашысцкімі карнікамі, асобным выданнем пабачыла свет у 1968 годзе. А ў «Полымі» твор быў надрукаваны ў 1967 годзе ў дванаццатым нумары. Васіль Быкаў пісаў пра свае ўражанні па свежых слядах, толькі яшчэ прачытаўшы аповесць. Напрыканцы 1968-га Іван Пташнікаў быў ужо вядомым пісьменнікам, аўтарам некалькіх кніг, рамана «Чакай у далёкіх Грынях». Рэцэнзіі на яго кнігі з'явіліся не толькі ў беларускай перыёдыцы, але і ў маскоўскім часопісе «Дружба народов». І Васіль Быкаў ужо меў сваю высокую вядомасць. У 1966 годзе «Новый мир» надрукаваў аповесць «Мертвым не больно»… Шквал крытыкі на беларускага празаіка наваліўся надзвычайны. І, канешне ж, Васіль Уладзіміравіч разумеў, што значыць сяброўская падтрымка, добрае слова, няхай сабе выкладзенае і ў прыватным лісце…

1998 год. І час іншы, і амбіцыі ў кожнага з пісьменнікаў, хто ўжо аддаў літаратуры ці не паўвека, былі, зразумела, немалыя… 16 жніўня 1998 года народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, зямляк Пташнікава, таксама ўраджэнец Лагойшчыны, піша Івану Мікалаевічу наступны ліст:

«Шаноўны Іван Мікалаевіч!

Упэўнены, што гэты ліст для Вас зусім нечаканы, і зусім няўпэўнены, што ён Вам патрэбен. Але дзякуй кажуць (а гэта ліст удзячнасці) не таму, што нехта надта твайго "дзякую" чакае, а таму, што ты не можаш яго не сказаць, што ты павінен яго сказаць, што гэта патрэбна табе, бо інакш неяк нядобра: табе падарылі вялікую радасць, а ты маўчыш, быццам і не атрымаў яе. Дык вось — дзякую, ад усяго сэрца дзякую за "Тры пуды жыта". Заадно — наўздагон — і за "Французжанак", і за "Львоў", і за ўсе іншыя выдатныя рэчы Вашай майстэрскай работы. Не сумняваюся, што крытыка скажа пра "Тры пуды" належнае слова і што гэты твор увойдзе ў залаты фонд беларускага апавядання. Бо ў ім — лёс нашага народа, нашай гаротнай вёскі, і адлюстраваны гэты лёс з такой праўдзівасцю, ад якой на сэрцы шэрхне, і з такой мастацкай яркасцю, якой у нашай нябеднай літаратуры няшмат. Тры пуды жыта (на самагонку для петражыцкіх) за забранае адно жыццё, за навек знявечанае-скалечанае другое, за дзесяцігоддзі пакут і здзекаў з чалавека, — хочацца крычаць ад болю, ад крыўды, ад жаху, што ахоплівае тваю істоту, і вечным праклёнам праклінаць тых, хто забяспечыў такі лёс беларускаму народу. Фінальная сцэна ў сюжэце — Александрына косіць — геніяльная: спачатку чырвоныя галоўкі бабку, а затым — гадзюк, а затым ужо і энкавэдыстаў-пагранічнікаў, а затым — наўзверх — і петражыцкіх! — як адно з неймавернай псіхалагічнай дакладнасцю пераходзіць у вачах Александрыны ў другое, — гэта геніяльна. Такой сімволікі ў творах пра лёс нашага народа яшчэ не было. А канцоўка! "Яна ў нас такая…" — кажа Аркадзя Вольцы. Імя — такая! Непераможная. Нязломная. Несмяротная. Бо Яна — гэта сама Беларусь. Брава, майстар! Вы — вялікі мастак, Іван Мікалаевіч. Здароўя Вам і здароўя і яшчэ раз здароўя. Хай і надалей гэтак жа хораша служыць Роднаму Слову і знябытаму ў пакутах народу Ваша залатое пяро!..

З глыбокай павагай Ніл Гілевіч…»

Гэтыя два лісты напісаны з інтэрвалам крышачку болей як у 30 гадоў. Лісты Васіля Быкава і Ніла Гілевіча захоўваюцца ў сямейным архіве Івана Пташнікава, якім беражліва апякуецца дачка геніяльнага беларускага празаіка — Таццяна Іванаўна Пташнікава.

Кастусь ЛЕШНІЦА

У вянок паэту

У фестывальнай палітры Беларусі не надта многа літаратурных свят. На Магілёўшчыне можна згадаць фестываль паэзіі і аўтарскай песні «Пісьмянкоў луг», які з 2006 года праводзіцца на малой радзіме Алеся Пісьмянкова ў Касцюковіцкім раёне. З 2019 года ў Краснапольскім раёне сталі арганізоўваць свята паэзіі «У вянок Аляксею Пысіну», прысвечанае знакамітаму паэту і журналісту. Арганізатарам свята выступае Краснапольская раённая бібліятэка імя М. Ткачова пры падтрымцы раённага выканаўчага камітэта.

Пераможцы анлайн-конкурсу чытальнікаў «Вянок Аляксею Пысіну».

24 верасня адбылося чацвёртае рэгіянальнае свята, прысвечанае Году гістарычнай памяці, якое сабрала аматараў паэтычнага слова Краснапольшчыны і суседніх Слаўгарадскага і Касцюковіцкага раёнаў. Сярод паэтаў — члены Саюза пісьменнікаў Беларусі і Міжнароднага саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў.

На пачатку ўдзельнікі наведалі мемарыяльны музей А. В. Пысіна ў Палужскай школе, затым усклалі кветкі да брацкай магілы ў гарадскім скверы. Краснапольская раённая дзяржаўная гімназія стала творчай пляцоўкай свята. У актавай зале сабраліся прадстаўнікі раённай улады, творчай інтэлігенцыі, гараджане рознага ўзросту, педагогі і навучэнцы ўстаноў адукацыі. У фае гімназіі раённай бібліятэкай былі афармлены выстаўкі «Паэтычны гонар Краснапольшчыны», «А. В. Пысін — майстар беларускага слова», «З гісторыі свята паэзіі «Вянок Аляксею Пысіну».

Асноўным лейтматывам свята стаў Год гістарычнай памяці і тэма малой радзімы. Напачатку ў выкананні навучэнцаў гімназіі гучалі неўміручыя пысінскія радкі: «Краснаполле», «Вузел», «Балада Буйніцкага поля», «Дала мне маці гэту мову...».

Марыя Разгонава, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Краснапольскага райвыканкама, прывітала ўдзельнікаў свята і нагадала пра багатыя культурныя і літаратурныя традыцыі рэгіёна.

Галоўны бібліятэкар Магілёўскай абласной бібліятэкі Галіна Дзятлава зазначыла, што паэзія Пысіна — унікальная з'ява ў айчыннай літаратуры. Аляксей Пысін павінен быў стаць трэцім народным пісьменнікам Магілёўшчыны поруч з А. Куляшовым і І. Чыгрынавым, але яго раптоўны сыход з жыцця парушыў усе планы, і Аляксей Васільевіч Пысін застаўся народным у душы і ў памяці землякоў...

Магілёўскай абласной бібліятэкай праводзіцца вялікая работа па захаванні памяці і творчай спадчыны Пысіна-журналіста і Пысіна-паэта: створаны электронны фотаальбом «Жыццё маё...», персанальны электронны бібліяграфічны паказальнік «Аляксей Пысін — журналіст», які ўключае больш за тры сотні поўных тэкстаў публікацый А. Пысіна з 1946 па 1981 гг., перасоўная выстаўка-дыярама «Пакуль зямля твая жывая, і ты — жывы». У Музейным пакоі гісторыі кнігі і бібліятэкі афармлена экспазіцыя «З будучым мінулае сшываю», дзе прадстаўлены дакументы, асабістыя рэчы паэта і ўзнагароды, у тым ліку медаль «За адвагу», бібліятэка паэта. Асаблівай каштоўнасцю з'яўляюцца кнігі з аўтографамі Ч. Айтматава, В. Астаф'ева, В. Быкава і інш.

З 2010 г. абласная бібліятэка штогод арганізоўвае навукова-практычную канферэнцыю «Пысінскія чытанні», прымеркаваную да дня нараджэння паэта. Удзел у ёй прымаюць навукоўцы, выкладчыкі, студэнты-філолагі, бібліятэкары і пісьменнікі з Беларусі і Расіі.

Нязменным удзельнікам чытанняў з'яўляецца найстарэйшы член Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Арцем'еў, які сябраваў з А. В. Пысіным каля трыццаці гадоў. Даследаванню жыцця і літаратурнай дзейнасці паэта Арцем'еў прысвяціў некалькі кніг, найбольш грунтоўную — «Народны душою...» — выдаў у 2020 г. да стагоддзя Пысіна.

Г. Дзятлава перадала ў фонд Краснапольскай раённай бібліятэкі паказальнік «Аляксей Пысін — журналіст» і кнігі В. Арцем'ева з аўтографамі.

У паэтычным конкурсе «Куточак майго дзяцінства» прынялі ўдзел паэты Краснапольскага, Касцюковіцкага, Слаўгарадскага раёнаў. Журы пад старшынствам члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталлі Азаранкі падвяло вынікі конкурсу: дыплом трэцяй ступені прысуджаны Галіне Каваленцы — бібліятэкару Ленінскай сельскай бібліятэкі Краснапольскага раёна, другой ступені — Сяргею Сыранкову з Краснаполля, першай ступені — Алесі Шаройцы з Касцюковіч.

Уладальнікам Гран-пры стала Людміла Марціновіч са Слаўгарада за верш «Мы едины, непобедимы». Дыпломы пераможцам уручыла намеснік старшыні Краснапольскага раённага выканаўчага камітэта А. Чаюкова.

У анлайн-конкурсе чытальнікаў «Вянок Аляксею Пысіну» прынялі ўдзел больш за 30 школьнікаў Краснапольшчыны. Па выніках конкурсу дыпломы пераможцам у трох узроставых намінацыях уручыла галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі М. Разгонава.

У рамках свята адбыўся паэтычны дэбют карэспандэнта Краснапольскай раённай газеты «Чырвоны сцяг» Дзіны Манько і настаўніцы ўстановы адукацыі «Краснапольская раённая дзяржаўная гімназія» Валянціны Казловай.

Творчая суполка — як адна вялікая сям'я. Сардэчныя віншаванні ад калег па пяры і раённай ветэранскай арганізацыі з нагоды 75-годдзя прымала член народнага паэтычнага аб'яднання «Світанак» Краснапольскага раённага Цэнтра культуры, лаўрэат прэміі А. В. Пысіна Галіна Мікалаеўна Яўсеенка.

У рамках свята ў маладзёжным цэнтры культуры і адпачынку «Міраж» адбыўся круглы стол «Паэзія — люстэрка маёй душы…», мадэратарам якога выступіла дырэктар Краснапольскай бібліятэчнай сеткі Алена Раманенка.

Слова Аляксея Пысіна жыло паўнакроўным жыццём, жыве і сёння. І будзе жыць… Па словах Віктара Ракава, сябра А. Пысіна: «...пысінскае слова ідзе. Яно хвалюе. Яно свеціць. Яно — на вуснах нашчадкаў...»

Галіна РАЗУМАВА
Фота дасланa аўтарам

Повязь слоў і малюнкаў

Перад вачыма — даўно забыты зборнік народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна «Лінія перамены дат». Выдадзены накладам 5000 экзэмпляраў у 1969 годзе ў выдавецтве «Беларусь», ён — рэдкі «госць» нават у букіністычнай краме. І ўсё па той прычыне, што вершы ў ім усё ж не забытыя.

«Першага снегу // Мяккі змрок, // Смелага смеху // Ціхі крок. // Лесу маўклівасць, // Цнатлівасць гурб. // Губ сарамлівасць, // Гарачых губ. // Сціхлы, ссівелы // Зімовы свет. // Уцэла, // Уцэла — // Глыбокі след…» У вершах, што склалі «новую кнігу лірыкі», шмат зімовага настрою, шмат снежнай вабнасці. І верш з прысвячэннем «Петрусю Броўку» носіць ясную, светлую і крохка-шкляную назву: «Заінелая Ушаччына». «Што хукаеш, раніца, // рукі пакрэплі? // Ачахлым вуголлем // на бальшаку // Снег лёгка вызвоньвае. // Крэкчацца грэблі // Смачна, // як свацці пасля першаку. // Аглухлі бары // ад зімовай сумоты…» Тут і «Слова марознае: // «Беларусь», і «завеі знясіленай // млявы лёт», і верш «Дзед Мароз»…

У кнізе, таленавіта, гранічна адкрыта афармленай Барысам Заборавым, — дзве паэмы: «Лінія перамены дат» і «Блакада».

…Па вясноваму цаліку
Партызанскай сцежкай патайнай
Сёння я прыйшоў
К Паліку
З невясёлым сваім пытаннем:
— Ты,
крывёю паліты
Палік,
Смуткам кожнае сэрца поўніш,
Хоць гадам сваім
Страціў лік,
Можа,
бацьку майго прыпомніш?
Не адказвае мне
Палік.
Недзе плача самотны кулік,
Як душа,
Што збавення просіць.
Засмучоная,
змоўкла просінь…

Тонкія лініі, востра, ясна выведзеныя таленавітым графікам, акрэслена фарміруюць барадулінскія вобразы, шчодра дадаюць да яго зіхоткіх моўных стрэл гучанне штрыха, нараджаюць повязі слоў і малюнкаў. Вокладка стылістычна цалкам адпавядае барадулінскай задачы прэзентаваць перад чытачом «Лінію перамены дат» як «новую кнігу лірыкі». Менавіта — лірыкі. І калі снежнае святло, снежнае хараство стала сілай пранікнення паэта ў глыбіню тэм і вобразаў, то вытанчаныя штрыхі мастака ўступілі ў спаборніцтва са словам. Уражанне такое, што і Барыс Забораў, і Рыгор Барадулін у спаборніцтве сваім аказваюцца знітаванымі, крэўна паяднанымі, глыбінна зразумелымі адзін аднаму.

Узняла брыво зара —
У трывозе возера.

Чайкі жнуць у два сярпы
Чараты густыя.
Крыўду, мурава, сцярпі:
Стома
ў стозе
стыне.
І вязуць зару чаўны
Проста ў двор дзявочы.
З хвалямі заручаны
Вёслы,
Вёсны,
Вочы.
(«Нарач»).

Рытмічная інтанацыя сугучная мастакоўскаму прачытанню кожнага верша, паэм Рыгора Барадуліна. Яснасць, яскравасць, зімняя сонечнасць наталяе асалодай адкрыцця новых паветраных калідораў. Складваецца ўражанне, што тую сцюдзёнасць, якая сілкуе многія старонкі «Лініі перамены дат», штрыхі Барыса Заборава саграваюць і разам з тым не разбураюць усёпранікальным сваім цяплом.

«Хаця ў азёр // не просіць неба просіні, // Ды ў спелым жыце // ўжо відаць здалёк, // Нібыта ў кнізе года, // васілёк // Паміж старонкамі // вясны і восені»… Барыс Забораў афарміў некалькі кніг свайго сябра, свайго паплечніка па служэнні беларускаму мастацкаму слову, якія выйшлі ў Мінску і Маскве. І кожная з іх, часам, сапраўды, забытых для чытача, — высокая з'ява мастацтва, напамін пра еднасць тэксту і афармлення, прыгажосць памкненняў да адкрыццяў чысціні і светласці.

Мікола БЕРЛЕЖ

Янка Брыль і Карэліччына

Ужніўні ў Карэліцкай раённай бібліятэцы адбылася літаратурная гадзіна «Непаўторны Янка Брыль», прысвечаная 105-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі, дзе прысутнічалі ветэраны працы Карэліцкага раёна. Удзельнікам імпрэзы нагадалі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, які нарадзіўся ў Адэсе, але дзяцінства прайшло ў вёсцы Загор'е Карэліцкага раёна, адкуль паходзілі бацькі хлопчыка. З цікавасцю паглядзелі дакументальны фільм пра слыннага земляка, пазнаёміліся з кніжнай выстаўкай, дзе сярод іншых кніг пісьменніка — некалькі тамоў новага дзесяцітомнага выдання яго твораў.

Янка Брыль вельмі любіў родныя мясціны і кожны год праводзіў цёплыя летнія дні на сваім лецішчы на хутары Крынічнае, каля вёскі Бераржна. Гэтае прыгожае месца знаходзіцца на высокім беразе Нёмана, сярод маляўнічай прыроды, якая натхняла пісьменніка на стварэнне новых цудоўных твораў. Шмат разоў, працуючы ў Бераржэнскай школе, я чула пра адметнага наднёманскага жыхара ад бераржэнскіх настаўнікаў, але тады сустрэцца з пісьменнікам не давялося. Пазней творца неаднаразова прысутнічаў на літаратурных і краязнаўчых мерапрыемствах, якія праходзілі ў Карэліцкім раёне. Удзельнікі Карэліцкіх краязнаўчых чытанняў з захапленнем слухалі цікавыя і змястоўныя выступленні земляка пра яго шлях у літаратуру, пра захапленні, пра гісторыю раёна, пра Карэліччыну ў полымі вайны, пра сяброў і землякоў, многія з якіх сталі прататыпамі твораў пісьменніка. Жывое, мілагучнае беларускае слова творцы зачароўвала і абуджала ў слухачоў добрыя і светлыя пачуцці.

Янка Брыль у верхнім радзе другі справа, Турэц.

Вельмі натхнёна прагучала гэтае слова на V Карэліцкіх краязнаўчых чытаннях, прысвечаных Адаму Міцкевічу. Праз усё жыццё пранёс пісьменнік любоў да паэзіі таленавітага земляка, якога таксама натхняла любоў да роднай Наваградчыны. Янка Брыль лічыў, што паэт — «з тых вялікіх, якія нам на ўсё жыццё, якіх мы бясконца перачытваем з непрытворным здзіўленнем ад зноў новай і зноў шчаслівa першаснай свежасці слова, думкі, пачуцця, якія цудадзейна ўздымаюць нас над марнотнай мітуснёй ды пошласцю нізкага, недастойнага існавання». Узнёслае слова прамоўцы не пакінула абыякавымі аматараў паэзіі А. Міцкевіча: «Няхай жа свяціцца яго імя — у вяках, на ўсёй зямлі, яднаючы людзей у мірным братэрстве, пра якое ён марыў, для якога працаваў і сёння працуе сваім несмяротным словам, сваёй чалавечнай, высакароднай душой!»

Адно са сваіх выступленняў на Карэліцкіх краязнаўчых чытаннях народны пісьменнік Беларусі закончыў словамі: «Зямля ў нас вельмі прыгожая. І мы ведаем, які ў нас цудоўны народ. На яго можна абаперціся. Ва Уладзіміра Караткевіча ёсць верш "На Беларусі Бог жыве". Мне хочацца сказаць, што калі на Беларусі сапраўды жыве Бог, то адна з яго пастаянных кватэр — наш Карэліцкі раён, наша родная Наваградчына. Я не хачу аддзяляцца ад нашай цудоўнай Наваградчыны, нашай старадаўняй Наваградчыны, багатай, разумнай і таленавітай. І хочацца ад душы пажадаць ёй шчасця».

Некалі аўтару гэтага артыкула пашанцавала знайсці ў выпускніцы Турэцкай школы З. Касцюк стары даваенны фотаздымак, на якім можна ўбачыць Янку Брыля і яго брата Міхася, вось толькі пажылая жанчына праз шмат гадоў не змагла ўспомніць, «каторы з іх Ясь, а каторы Міхась». Давялося зрабіць копію фотаздымка і пераслаць Янку Брылю, каб удакладніць, а заадно запытацца пра настаўнікаў і вучняў, якія зняліся разам з братамі.

12 студзеня 2003 года я атрымала ад пісьменніка ліст, у якім ён пісаў: «Паважаная Святлана Андрэеўна! Здымак зроблены вясной 1928 года, каля царквы, побач з якою стаяла старая драўляная школа, што датрывала, здаецца, да 70-х гг. Фатограф Аляксандр Цітавіцкі з Турца, уся апаратура якога, негатывы і шматгадовыя здымкі, на вялікі жаль, згарэлі гадоў некалькі пасля вайны…

На здымку вучні V і IV класаў, але чамусьці не ўсе, не бачу нікога з вучняў з вёсак Лыкавічы і Рап'ёва. За хлопцамі — дырэктар ("кероўнік") школы Міхал Пранеўскі, паляк, але былы рускі афіцэр, франтавік у першую ўсясветную вайну; выкладаў матэматыку, фізіку і часам на беларускіх уроках замяняў сваю жонку, Марыю Пранеўскую, якая пасярэдзіне тройкі настаўнікаў. Яна выкладала польскую і беларускую мовы, спевы, кіравала школьным хорам і мастацкай самадзейнасцю. Абое яны ў гады акупацыі загінулі ў Калдычэўскім лагеры смерці. Справа ад Пранеўскай — Марыя Фітэлёва, настаўніца гісторыі і нямецкай мовы. Злева — Людвік Галушка, на якім была гімнастыка, гігіена і розныя замены; ён быў прымак у фальварачку ў Бударкевічаў каля Лыкавічаў, выехаў у Польшчу з сям'ёю пасля вайны. Настаўнікі тут не ўсе, аднак прозвішчы не магу ўспомніць. "Закон Божы" выкладаў стары айцец Іосіф Туміловіч, якога на здымку чамусьці няма».

Далей пісьменнік з вялікай скрупулёзнасцю пералічвае прозвішчы амаль усіх вучняў на здымку. Адказаў і на маё пытанне — «каторы Ясь, а каторы Міхась?»:

«Хлопцы ў апошнім радзе, злева направа: школьныя мастакі і сябры, мой на тры гады старэйшы брат Міша і Паўлуша Выдрыцкі, за якім трэці пяцікласнік Шура Брылевіч з Браносава, а тады чатырохкласнікі: Міша Ламан з Загор'я, «турчакі» Лейзар Бісінкевіч, Абрам Араноўскі (дарэчы — Зяма ў маёй аповесці «Золак, убачаны здалёк»), Мішка Курчыцкі, тады я (у школе мяне звалі Ясем) і пяцікласнік Аляксандр Курчыцкі…»

«Задума Ваша, "Напамінак старых фотаздымкаў", цікавая, — піша далей пісьменнік. — Бог мой, як тут прыдаўся б Цітавіцкі з яго фотаархівам! Паспытайцеся ў Турцы, у Паўла Абадзінскага і іншых, магчыма, у сваякоў ды знаёмых Цітавіцкага сёе-тое і захавалася».

Сапраўды, некаторыя фотаздымкі знайшліся, і я змясціла іх разам з тым, пра які ішла гаворка вышэй, у сваёй кнізе, і вось цяпер з задавальненнем убачыла стары здымак у новым дзесяцітомным выданні твораў пісьменніка.

Яшчэ адзін фотаздымак быў знойдзены ў вёсцы Палужжа, дзе жыла некалі сястра Янкі Брыля. На здымку, як паведаміў пісьменнік, іх сям'я, знятая ў Адэсе ў верасні 1919 года. Пісьменнік назваў усіх, хто трапіў у аб'ектыў, і паведаміў даты жыцця родных.

Перапіска наша вялася ў 2003 годзе, а напрыканцы 2005-га Янка Брыль, якому я адправіла сваю кнігу, прыслаў паштоўку, дзе напісаў: «27.XII.05 Дарагая Святлана Андрэеўна! Дзякую за падарунак. Кніга цікавая і патрэбная. Ад душы віншую Вас з яе выхадам і жадаю далейшых поспехаў у пошуках і знаходках. З Новым годам!» Трохі раней атрымала я і кнігу лірычных замалёвак пісьменніка «Сцежкі, дарогі, прастор» з аўтографам аўтара, якую захоўваю ў сваёй бібліятэцы як каштоўную рэліквію разам з лістамі Янкі Брыля.

Святлана КОШУР

Узнагарода за пройдзены ўрок

Калектыўная выстаўка айчынных мастакоў «Восеньскі салон», якая нядаўна праходзіла ў сталіцы, завяршылася яркай інтэрактыўнай запамінальнай падзеяй — мерапрыемствам «Ноч мастацтва», дзе кожны з наведвальнікаў мог знайсці тое, што яму цікава, адпачыць і нешта даведацца з гісторыі стварэння карцін — не толькі сучасных, прыналежных пэндзлю майстроў, якія яшчэ шукаюць сябе, але і тых, што былі створаны слыннымі мастакамі, патанцаваць пад жывую электронную музыку і паўдзельнічаць у творчых перформансах.

Работы, прадстаўленыя да ўвагі наведвальнікаў, выглядалі рознымі і па ўзроўні майстэрства, і па тэматыцы, і па тэхніках выканання: нямала было падобных на класічныя пейзажы кампазіцый з выявамі людзей, жывёл, кветак, скульптур і арт-аб'ектаў, дзе сваёй арыгінальнасцю і нечаканасцю, навізной увасаблення вабіла найперш ідэя, але сустракаліся і такія, што прымушалі задумацца, наколькі яны ўвогуле атаясамліваюцца з паняццем мастацтва.

Адной з найбольш запамінальных для аматараў сучаснага мастацтва цікавостак стала інтэрактыўная гульня па экспазіцыі «Шостае пацуццё». Ідэя яе была скіравана на тое, каб глядач змог успрыняць у поўным аб'ёме ўсе арт-аб'екты выстаўкі, — а гэтага дасягнуць надзвычай складана, калі проста ходзіш ад адной карціны да іншай. Так, удзельнікам своеасаблівага квэсту прапаноўвалася адшукаць і сабраць часткі пазла — прыхаваныя ў розных лакацыях *QR*-коды з дапоўненай рэальнасцю. Неардынарная канцэпцыя адбілася і ў назве інтэрактыву: рэч у тым, што ўсяго арт-аб'ектаў, неабходных для вывучэння, было пяць. Паглыбляючыся ў іх мастацкую прыроду, ідучы ўслед за стваральнікам, удзельнікі развівалі ў сабе здольнасць глядзець на творы мастацтва не толькі зрокам, але і душой.

Гэтай жа мэтай — дапамагчы наведвальніку навучыцца лепш разумець мастацкія творы, чытаючы пасылы, увасобленыя ў арт-аб'ектах праз сродкі выяўлення — кіраваліся арганізатары сустрэчы з маладымі мастакамі Андрэем Савіцкім, Настассяй Акулавай, Ганнай Мельнікавай і Хрысцінай Высоцкай. «Што хацеў сказаць мастак?» — пытанне, закладзенае ў назве дыскусіі, не з'яўляецца папулярным для абмеркавання ў асяродку філосафаў ад мастацтва, — маўляў, яно не варта ніякіх інтэрпрэтацый, — кожны разумее так, як разумее, зыходзячы з уласных духоўных набыткаў. Але, пагадзіцеся, чым большы набор «інструментаў для прэпарыравання» ты маеш, тым большая прастора для ўласных высноў у цябе з'яўляецца і тым больш захапляльны сам працэс спазнання мастацтва. У гэтым мелі магчымасць пераканацца наведвальнікі выстаўкі, якія прысутнічалі на сустрэчы. Камунікацыя ладзілася апасродкавана на прадстаўленых да абмеркавання творах: кожны з мастакоў распавядаў пра сваю карціну альбо арт-аб'ект самае патаемнае, — ад узнікнення задумы да яе рэалізацыі, не пазбягаючы нейкіх прамежкавых крокаў, што потым даводзілася выпраўляць праз іх памылковасць; а таксама пра пасылы, якія ўкладаліся ў твор у цэлым і асобныя яго фрагменты.

Найбольш шырокую дыскусію выклікала карціна Настассі Акулавай «Чорная зорка». Герой палатна прадстаўлены ў даволі нязвыклым для ўспрымання выглядзе: постаць, падобная на цемнаскурую жанчыну з размаляваным тварам і чорным крылом, выяўлена на фоне чорнага лесу і свяціла — сонца ці поўні. На кантрасце акцэнт змяшчаецца на чорную зорку, выпушчаную з далоні анёла. Уражваюць яго вочы: у іх затаіўся глыбокі сум ці нават жалоба, і глядзяць яны, здаецца, проста ў душу, усё ведаюць, разумеюць і прымаюць. І гэта выглядае на ўсе сто адпаведным аўтарскай задуме: чорная зорка — гэта ўзнагарода чалавеку за пройдзены ўрок, за пэўнае веданне, што адкрылася ў выніку пройдзеных выпрабаванняў, не заўсёды простых, лёгкіх, прыемных…

Дар'я Карпава. Серыя «Залатая бульба», 2020 г.

Пэўныя работы на выстаўцы былі ўвасабленнем не толькі мастацкіх пошукаў, але і натхнёнымі даследаваннямі ўласнай гісторыі. Так, мастачку Надзею Хмыль зачаравала яе бабуля, у гонар якой дзяўчына атрымала імя. Псіхолагі, пэўна, трактавалі гэтую тэму як завяршэнне гештальту: бабуля пайшла з жыцця, калі будучай мастачцы было ўсяго дзесяць гадоў. Спрабуючы аднавіць у памяці вобраз роднага чалавека, Надзея ўсвядоміла, што без старонняй дапамогі ёй гэта не па сілах. Так, мастачка запытваецца ў сябе (але і, адпаведна, у гледача, прадставіўшы свае работы да яго ўвагі): што лепш адлюстроўвае асобу чалавека і мае большую дакладнасць: дакументальны здымак, які зафіксаваў рэальны момант мінулага і знешнасць чалавека, альбо партрэт, створаны з любоўю і ўласным адчуваннем блізкай душы? Апрацаваная штучным інтэлектам выява твару, дзе выпраўлены недахопы невыразнага здымка, ці карункавая сурвэтка, кожнае вочка якой захоўвае цяпло любімых рук? Мастачка прапануе, каб кожны сам паразважаў над тэмай, натхніўшыся серыяй работ «Альбо / альбо?».

«Адпаведныя мерапрыемствы заўжды натхняюць на працу, хоць яна ў мяне не звязана з творчасцю. Рада, што пабачыла шмат таленавітых людзей. Вельмі добра, што падобныя выстаўкі ў нас набываюць усё большы маштаб і становяцца папулярнымі не толькі сярод моладзі, але і людзей сталага ўзросту. Усё тут крэатыўнае, жывое, з добрай энергетыкай. Імпануе разнастайнасць ідэй і творчых задум — здзіўляе, як у людзей працуе мозг і што яны так неардынарна мысляць», — падзялілася ўражаннямі Аляксандра Куляшова, наведвальніца «Ночы мастацтва», мая выпадковая суразмоўца.

Яна БУДОВІЧ,
фота аўтара

Настасся Акулава «Чорная зорка», 2021 г.

Наталля Рыкава «Першы дзень», 2022 г.

Ператварыць уражанні ў вобраз

Юлія Цярэшка.

Сёлета на «Восеньскім салоне» было прадстаўлена шмат работ маладых мастакоў, чые імёны пакуль не на слыху. Сярод іх і Юлія Цярэшка. Пра творчасць, натхненне і шлях да майстэрства яна распавяла чытачам нашай газеты.

— Давайце вернемся крыху ў мінулае. Як пачынаўся? Дзе вучыліся, як вырашылі стаць прафесійным мастаком?

— Пачаткам і асновай, як звычайна гэта адбываецца, была мастацкая школа. Затым я паступіла ў Мінскі дзяржаўны каледж імя А. К. Глебава на спецыяльнасць «Жывапіс (станковы)». Пасля было некалькі гадоў падагагічнай практыкі. І, нарэшце, калі канчаткова вызначылася з напрамкам, які мяне найбольш цікавіць, паступіла ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў на кафедру манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

— А як знайшлі свой стыль?

— Ёсць некаторыя рысы, вобразы, што пераходзяць з адной работы ў іншую. Штосьці пазнавальнае. Але самога ўласнага стылю, нейкай цэласнасці — нават калі гаварыць пра серыі ці карціны, зробленыя ў невялікія прамежкі часу — мае работы пакуль не маюць. Усё распрацоўваецца.

— Дзе вы знаходзіце сюжэты для работ? Што натхняе?

— Гэта заўсёды яснасць вобраза. Калі я проста ведаю, як работа павінна выглядаць у выніку. Патрэбны канцэнтрат рэальнасці, нейкіх уражанняў, якія потым увасабляюцца ў карціне.

— На сайце артцэнтра пазначана, што вы даволі актыўна выстаўляецеся. Як адбіраеце карціны для экспазіцыі?

— Напрыклад, на працягу семестра робіцца многа работ у розных тэхніках: класічных, эксперыментальных. З рознымі сюжэтамі. Навучальнымі ці паводле маіх асабістых задач. Я пакуль удзельнічаю у вялікіх групавых выстаўках, дзе няма пэўнай акрэсленай вузкай тэмы, прысвячэння нечаму канкрэтнаму. Таму выбіраю самае цікавае для сябе. Штосьці, што хачу ўбачыць у галерэі сярод іншых работ, пачуць водгукі. Гэта могуць быць навучальныя пастаноўкі або карціны, зробленыя па-за акадэміяй.

— А цяпер — пра вашы работы на «Восеньскім салоне»…

— Гэта тры аўтапартрэты (усяго ў серыі *«Alma Mater»* шэсць работ) у тэхніцы сграфіта з элементамі фрэскі і мазаікі са смальты. Вялікай увагі заслугоўвае матэрыял: ён дадае сэнсу для мяне. Сграфіта і фрэска маюць падобную аснову — вапна і пясок. Фактура пяска і рэльеф сграфіта адсылаюць да вельмі старажытнай эстэтыкі. Але сам вобраз блізкі да сюррэалізму. У цэлым гэтая серыя — спроба пабачыць сябе.

— Як увогуле адбываецца працэс стварэння карціны? Колькі часу трэба на адну работу?

«Аўтапартрэт з ластаўкай».

«Імага. Аўтапартрэт».

— Усё залежыць ад сканцэнтраванасці, таго, наколькі я дакладна ўяўляю вобраз, наколькі моцныя ўражанні. Напрыклад, у тэхніках, выкарыстаных у серыі аўтапартрэтаў — сграфіта і фрэска, — на роздум мала часу. Трэба ўсё рабіць хутка — пакуль сохне раствор.

— Ці ёсць у вас любімая карціна са сваіх?

— Ёсць «часова любімыя», калі так можна сказаць. Але часта адбываецца так, што пачынаюць цікавіць работы, якія падаваліся калісьці няўдалымі.

— І апошняе: што для вас мастацтва?

— Адкажу так: праніканне, разуменне, гештальт, вобразная мова.

Арына ПРАНІКАВА

Сёмы фестываль дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія.DOC» прайшоў у Смаленску і Мінску 3—7 кастрычніка. Упершыню мерапрыемства адбылося ў чэрвені 2016 года. Смаленск і Мінск — менавіта гэтыя гарады сталі пастаяннымі яго пляцоўкамі. Ужо тады «Еўразія.DOC» быў месцам сустрэчы. У фестывалі ўдзельнічалі не толькі шмат краін постсавецкай прасторы, але і дакументалісты з США, Германіі. Кінафорум не абмяжоўвае, прымае ўсіх ахвотных. Адзіная ўмова адбору: фільмы павінны адлюстроўваць падзеі, якія паўплывалі на жыццё краін СНД. Відавочна, што шмат каго з аўтараў цікавіў сацыяльна-палітычны бок. Гэта адбываецца і сёння: многія работы былі прысвечаны важным датам, праблемам сучаснасці ці падзеям, якія ўскалыхнулі свет, засталіся значнымі старонкамі ў гісторыі.

Захавальнікі гісторый

Сёмы форум атрымаў рэкордную колькасць заявак — 215 з 12 краін былога СССР і далёкага замежжа. Але ў кароткую праграму мерапрыемства трапіла толькі 32 дакументальныя фільмы. Усе работы можна было свабодна паглядзець. У праграму ўваходзілі не толькі кінапаказы. З першага фестывалю захавалася традыцыя праводзіць сустрэчы з аўтарамі, круглыя сталы, прэс-канферэнцыі, дыскусіі. «Еўразія. DOC» дазваляе гледачам сказаць сваё слова. Пасля прагляду фільма ёсць магчымасць падзяліцца меркаваннямі, задаць пытанні аўтару. У гэтым годзе таксама праводзіліся майстар-класы, на якія акрамя дакументалістаў, стваральнікаў кіно запрашалі журналістаў, грамадскіх дзеячаў, экспертаў. Фестываль дазваляе раскрыцца і творцам, якія толькі пачынаюць свой шлях у індустрыі. Шосты раз праходзіў маладзёжны конкурс дакументальных фільмаў: «Еўразія.DOC: 4 хвіліны».

Урачыстае адкрыццё адбылося ў Смаленску. Фестываль пачаўся з прэс-канферэнцыі, дзе арганізатары і журы распавялі пра далейшыя планы, пасля чаго былі прадэманстраваны трэйлеры конкурсных фільмаў з Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Кыргызстана, Расіі і іншых краін. Таксама ўдзельнікамі кінафоруму сталі дакументалісты з Германіі і нават Кітая. Права быць першым прадстаўленым аўдыторыі атрымаў фільм «Расія. Нам 30 гадоў!» Святланы Музычэнкі. Паказы занялі два дні, і гэта стала толькі часткай праграмы.

6 кастрычніка «Еўразія.DOC» пераехаў у Мінск. Асноўнай пляцоўкай форуму стаў кінатэатр «Беларусь». Там жа прэзентавалі спецыяльны мультымедыйны праект «Беларусь. Гісторыя». Гэта серыя кароткаметражных анімацыйных відэа пра знакамітых людзей краіны: ад дзеячаў даўніх часоў да нашых сучаснікаў. Стваральнік праекта — праграмны дырэктар фестывалю «Еўразія.DOC» Валерый Шахаўцоў. Кароткі фармат разлічаны на тое, каб выклікаць цікавасць у гледача і жаданне больш даведацца самому. Завяршыліся спецыяльныя мерапрыемствы творчай сустрэчай з госцем фестывалю — пісьменнікам і палітолагам з Германіі Уладзімірам Сергіенкам.

Кадр з фільма «Гаспадыні Удоры».

Паказ фільмаў прадоўжыўся ў тым жа кінатэатры «Беларусь». У першы дзень прадставілі шмат работ расійскіх дакументалістаў. Таксама гледачы пазнаёміліся з творцамі з Германіі, Азербайджана. Цікавасць выклікаў фільм кітайскай вытворчасці «Зямля вялікіх кошак». Рэжысёр — Дар'я Стрыгіна (яна працуе карэспандэнткай тэлеканала *CGTN* Медыякарпарацыі Кітая) раскрывае экалагічную тэму, якая вельмі хвалюе сучаснікаў. «Вялікія кошкі» — гэта амурскі тыгр і далёкаўсходні леапард. Нягледзячы на пагрозлівы выгляд, моцныя лапы і вострыя кіпцюры, яны часта застаюцца безабаронна перад чалавекам. Бездаказнасць і жорсткасць людзей маглі прывесці да іх поўнага вымірання. Але трагедыі ўдалося пазбегнуць: Кітай сумесна з Расіяй намагаецца зрабіць усё, каб захаваць іх папуляцыі. Пра цяжкасці і будучыя планы расказвае гэтая гісторыя.

Адметны фільм «Дом на вулкане», які атрымаў дыплом «За высокую мастацкую культуру». Работа пра людзей, якія жывуць літаральна на прыроднай параховай бочцы. Гісторыя прыйшла да нас з Азербайджана, а ўвасобіў яе Аміль Мамібейлі — аўтар сцэнарыя і рэжысёр. Галоўная гераіня фільма — Акібат. Яе дом быў разбураны вулканам. Хутка пасля гэтай падзеі памёр муж. Праз тры гады дзяржава пабудавала ёй новы дом, на тым жа месцы. Зараз Акібат жыве ў адзіноце, і кожны яе дзень напоўнены страхам, што калі-небудзь вулкан прачнецца і гісторыя паўторыцца.

Калі пры слове «вулкан» адразу ў галаве паўстае вогненная стыхія, якая бязлітасна знішчыла Пампеі, то ў фільме размова пра іншую ўнікальную прыродную з'яву — гразевыя вулканы. У Азербайджане іх знаходзіцца каля трохсот. У асноўным яны лічацца бяспечнымі. Некаторыя нават з'яўляюцца турыстычнымі мясцінамі.

Але камера ловіць шмат аб'яў: «Прадам дом», «Прадаецца зямля». Бо, нягледзячы на доўгія перыяды цішыні, мноства людзей насамрэч баяцца, што за адзін дзень усё можа быць знішчана. Пад нагамі вулкан кіпіць: відаць цёмныя мокрыя плямы на шэрай зямлі з павуціннем трэшчын. Азербайджан паўстае зусім не сонечным і цёплым — нейкім манументальным, пагрозлівым. Пастаянна адчуваецца схаваная трывога, але жыццё ідзе. Дзеці вяртаюцца са школы, мужчыны гуляюць у даміно. Чуваць урыўкі размоў пра падзеі ўнутры краіны. І галоўная гераіня Акібат займаецца сваімі справамі пад балбатанне тэлевізара. Усё як звычайна. Пакуль вулкан яшчэ спіць.

Чалавек у пераменлівым сусвеце — адна з тэм фестывалю. Сапраўды, падзеі сучаснасці перавярнулі ўсё. Але штосьці застаецца нязменным. Ёсць некаторыя куткі нават даволі блізка да нас, дзе захоўваецца амаль старажытны спакой. Пра тое распавядае дакументальны расійскі фільм «Гаспадыні Удоры», які атрымаў Прыз старшыні журы фестывалю дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія. DOC». Глядач пераносіцца ў невялікае сяло Крывое Удорскага раёна Рэспублікі Комі, дзе штогод праводзіцца абрад, прысвечаны святой Параскеве Пятніцы. Рэжысёр Ганна Каракоўцава вылучыла два галоўныя словы, адлюстраваныя ў гэтай рабоце, — Бог і Радзіма.

Сяло Крывое незвычайнае тым, што менавіта там захаваліся традыцыі стараверства. З'яўляецца адчуванне, быццам трапляеш у іншы час: людзі традыцыйна збіраюць зёлкі, перадаюць даўнія звычаі з пакалення ў пакаленне. Некаторыя дзеі ўвогуле немагчыма ўбачыць проста так — гэта закрытае таемства. Тым і цікавае.

Кадр з фільма «#ЗАЖИВОе».

Сюжэт складаецца з гісторый жанчын (менавіта таму, што Параскева Пятніца — заступніца жанчын). Выбраная форма нагадвае інтэрв'ю: увага канцэнтруецца толькі на гераінях, пытанні — за кадрам. Рэжысёрка намагалася наблізіцца да жывой размовы, каб жынчыны ўвогуле забылі пра камеры. Прынцыпова, каб гэта не было падобна да выпуску тэлепраграмы.

Лёсы гераінь розныя, але іх шляхі, дзе б не знаходзіліся, прыводзяць у гэтае далёкае сяло Крывое. Нескладана зразумець, чаму: месца нібыта чароўнае, амаль містычнае. І адчувальна, што, у параўнанні з тым жа хуткім горадам, ім лягчэй на зямлі, з-пад якой дыхае нешта магутнае. Мабыць, таму жыццё Крывога працягваецца, калі падобныя мясціны вакол — у заняпадзе.

Падрабязнае знаёмства з удзельнікамі фестывалю прадоўжылася на другі дзень. Ад Беларусі быў прадстаўлены фільм «Тры дні свабоды» Дзмітрыя Сарокі, які адзначаны дыпломам «За творчае асэнсаванне важнай вяхі ў гісторыі Беларусі» (дарэчы, у праграму паказаў увайшло чатыры фільмы беларускіх дакументалістаў). Гісторыя распавядае пра падзеі верасня 1939 года, калі ў Скідзелі адбылося паўстанне супраць польскай улады.

Два творы прадставіла Арменія: «На дне» Арарата Грыгарана і «Дарога» Эдгара Саркісяна. Закрываў мерапрыемства пазаконкурсны паказ фільма «Я не Лакіт» рэжысёркі з Лівана Марыі Сурае. «Лакіт» — азначае незаконнанароджанае пакінутае дзіця. І па законах Лівана ў яго няма ніякіх чалавечых правоў. Такім з'яўляецца галоўны герой Салех. Ён не можа атрымаць адукацыю. У яго няма дома і нават прозвішча. Салех для сваёй краіны, для людзей навокал — ніхто. «Я не Лакіт» паказвае іншы бок прагрэсіўнага свету: не ўсім людзям і сёння даступны самыя звычайныя рэчы ў жыцці, а на некаторых тэрыторыях вялікага зямнога шара існуюць дзіўныя супярэчлівыя законы,

Завяршыўся сёмы фестываль дакументальнага кіно «Еўразія.DOC» урачыстай цырымоніяй узнагароджання пераможцаў. Гран-пры журы вырашыла аддаць фільму «*Remember Odessa*. Не забудзем, не прабачым» Вільгельма Домке-Шульца, дакументаліста з Германіі. Адзін з галоўных прызоў атрымаў і беларускі фільм «#ЗАЖИВОе» рэжысёра Паліны Лушчык. Тэма — Вялікая Айчынная вайна.

Кадр з фільма «Зямля вялікіх кошак».

Таксама журы адзначыла работы «Неўскі пятачок. Апошні сведка. Міхаіл Зорын. "Жыццё працягваецца!"» (Пётр Карагін, Расія), «Матанат» (Шухрат Махмудаў, Узбекістан) і «Сусветы Маі» (Марына Чувайлава, Расія). У маладзёжным конкурсе кароткаметражных дакументальных фільмаў «Еўразія.ДОК: 4 хвіліны» першае месца заняла работа з Беларусі «Застацца ў жывых» Аксаны Канашыц.

Такія вынікі фестывалю ў гэтым годзе. Віншуем пераможцаў і ўсіх удзельнікаў.

Арына ПРАНІКАВА

Bellissimo ад Анісімава,

або Каб вушы чулі, а вочы бачылі

Прыгажосць і высакароднасць, якія нараджаюцца ўнутры, імкнуцца вырвацца вонкі, праявіцца, як кветка, што ў зададзены час расцвітае... Кажуць, ад лішку сэрца гавораць вусны. Значыць, па словах, па творчых праявах можна пазнаць, што ў чалавека ў сэрцы. Бязмежная крыніца любові, творчасці, спагады і чуйнасці — такім мне адчулася сэрца Аляксандра Анісімава, галоўнага дырыжора і мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь, народнага артыста Беларусі, падчас канцэрта *«Sympho Gala»* ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, зладжаным да 75-гадовага юбілею маэстра.

Неверагодная дзея, роўная па маштабах касмічнай з'яве, паўстала дзякуючы творчым знаходкам і руплівасці музыкантаў Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь і зводнага хору — Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Р. Шырмы пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора Вольгі Янум, Дзяржаўнага камернага хору Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Наталлі Міхайлавай, Акадэмічнага хору Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Андрэя Саўрыцкага. Аздобілі мерапрыемства, стварыўшы неабходны канцэптуальны і сэнсавы стрыжань, салісты: заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Юлія Стэфановіч, лаўрэат міжнародных конкурсаў Раман Фірстаў, а таксама сапрана Ірына Крыкунова, бас-барытон Уладзімір Байкоў, мецца-сапрана Кацярына Міхнавец.

Маэстра Аляксандр Анісімаў прымае віншаванні.

Даведка «ЛіМа»:

Аляксандр Міхайлавіч Анісімаў — галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь. Запрошаны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі і Вялікага тэатра Расіі, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, уладальнік медаля Францыска Скарыны, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, лаўрэат расійскіх нацыянальных тэатральных прэмій «Залатая маска» і «Легенда».

Маэстра Анісімаў выступаў у найбуйнейшых тэатрах свету, сярод якіх Вялікі тэатр Расіі, Тэатр Калон у Буэнас-Айрэсе, Карла Фелічэ ў Генуэ, Ла Фенічэ ў Венецыі, Опера Бастый і Опера Гарнье ў Парыжы, Вялікі тэатр Лісо ў Барселоне, Дзяржаўныя оперы Гановера і Гамбурга, Камішэ-Опер у Берліне, Гранд Апера ў Х'юстане, Опера Сан-Францыска, Сіднейская опера. Дырыжыраваў шматлікімі знакамітымі аркестрамі Расіі і краін Еўропы, у тым ліку Кансерт-гебаў, Ратэрдамскім філарманічным, Сімфанічным аркестрам Бірмінгема, Каралеўскім філарманічным аркестрам Ліверпуля, Лонданскім сімфанічным і інш.

У 2021 годзе маэстра Анісімаў удастоіўся спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За значны асабісты ўклад ва ўмацаванне міру і згоды ў грамадстве праз музыку, за рэалізацыю буйных рэспубліканскіх і міжнародных творчых праектаў».

Святочная праграма прадставіла пяць шэдэўраў класічнай сімфанічнай музыкі: Іагана Себасцьяна Баха, Леапольда Стакоўскага, Дзмітрыя Шастаковіча, Рыхарда Штрауса, Георгія Свірыдава. Найярчэйшыя пласты прадстаўленай музычнай праграмы, што складалася з двух аддзяленняў, — музыка Рыхарда Штрауса і Георгія Свірыдава, як адзначыў сам Аляксандр Анісімаў, гаспадар музычнай стыхіі, натура тонкая і шматгранная.

— Я, перш за ўсё, мастак, і вельмі абвострана адчуваю прыналежнасць да таго, чым мы — інтэрпрэтатары класічнай музыкі — займаемся, — адзначае маэстра Анісімаў. — Сапраўды, адна з задач, якую вырашае мастацтва, — несці ачышчэнне і даваць адухоўленасць. І мы з гэтым непарыўна звязаны. Мы змыкаемся ў гэтым сэнсе з рэлігіяй. Нездарма наш дом — філармонію — называюць храмам музыкі. І таму маё служэнне ў многім накіравана на тое, каб рабіць людзей чысцейшымі, прагажэйшымі, каб вушы чулі, а вочы бачылі прыгажосць гэтага свету.

Момантаў, калі гледачы баяліся парушыць апладысментамі крыштальна празрыстую, здаецца, сусветна абгрунтаваную паўзу паміж зменай частак твора, было вельмі шмат. Адзіная канва надзвычай глыбокага музычнага аповеду, які па-майстэрсу выбудоўваў маэстра Анісімаў, стала не інакш як трамплінам у іншае вымярэнне, дзе пануе дасканаласць і прыгажосць. Прынамсі, гуллівыя, а часам пакорлівыя музычныя хвалі дакраналіся да свядомасці, якая перажывала дзіўнае хваляванне ад сустрэчы з гранічна шчырым музычным выказваннем. Опера «Саламея» — найлепшы таму прыклад: незвычайнае багацце палітры дае магчымасць спасцігнуць новыя сэнсы. «Саламея» сёння з'яўляецца самай папулярнай операй Штрауса, штогод даецца каля 100 спектакляў, і, як падлічылі, яна гучыць кожныя 2-3 дні на працягу тэатральнага сезона. Дарэчы, за больш чым 100 гадоў свайго існавання гэтая опера зазнала шмат вядомых інтэрпрэтатараў: дырыжораў Карла Бёма, Георга Шолці, Фрыца Райнера, Герберта фон Караяна, спявачак Біргіт Нільсан, Тэрэзу Стратас, Леоні Рызанек, Любу Веліч.

Другі важны пласт праграмы — «Патэтычная араторыя» Георгія Свірыдава. Сам Свірыдаў прадугледжваў ад 150 да 200 чалавек хору — які маштаб! На канцэрце ў філармоніі лічба стала таксама ўнушальнай — больш чым сто чалавек.

Аляксандр Анісімаў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Аляксандра Анісімава з 75-годдзем:

«Дзякуючы шматграннаму дырыжорскаму таленту і надзвычайнай працаздольнасці вы ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай культуры, падарылі шчаслівы сцэнічны лёс шматлікім творам айчынных кампазітараў і радасць сустрэч з высокім мастацтвам сапраўдным знатакам класічнай музыкі», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт адзначыў сімвалічнасць таго, што разам з Аляксандрам Анісімавым у гэтым годзе святкуе свой юбілей Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, з якім непарыўна звязаны творчы шлях дырыжора.

«Упэўнены, яшчэ доўгія гады вы будзеце захапляць прыхільнікаў сваім майстэрствам, прымнажаць музычныя скарбы нашай Радзімы і ўсяго свету», — перакананы беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Аляксандру Анісімаву моцнага здароўя, дабрабыту і новых прафесійных дасягненняў.

— «Патэтычную араторыю» кампазітара Свірыдава мы, артысты хору і аркестра, выконвалі з вялікім натхненнем і запалам, — дзеліцца артыст Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Р. Шырмы Дзмітрый Кулакоў. — Маэстра Анісімаў валодае вялікім майстэрствам прачытання і інтэрпрэтацыі твораў вялікага маштабу. У «Патэтычнай араторыі» вельмі ярка

Сімбіёз трох хароў і аркестра — неверагодная музычная з'ява.

адлюстравана эпоха, чаканні, думкі ды памкненні. У кожнай ноце адчуваецца стаўленне Георгія Свірыдава да паэзіі Уладзіміра Маякоўскага, да яго яркага, эпатажнага стылю, у якім паэт адлюстроўваў сваю эпоху пераўтварэння свету. Музычныя сродкі, якія задзейнічаў Свірыдаў, узмацніў і падкрэсліў стыль паэта.

Сапраўды, дзіўнае спалучэнне пазачасавых вершаў Уладзіміра Маякоўскага і экстраардынарных здольнасцей кампазітара дае адчуванне заўсёды свежага подыху гэтай музыкі. Твор нячаста выконваўся і ў Расіі, і ў Беларусі, хоць у 1960 годзе атрымаў Ленінскую прэмію. Прычына — складанасць выканання. Ды гэтым разам адбыўся цуд. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы Аляксандру Анісімаву.

— Адзначаючы гэты важны дзень, не толькі прымаеш падарункі, а быццам і робіш сам — тым, хто прыйшоў у глядзельную залу і нават тым, хто выконвае гэтую музыку, — падзяліўся маэстра. — Думаецца, вы адчуваеце маё нераўнадушша да партытур, якія мы выконваем. Працаваць у асяроддзі тых, хто цябе разумее, — шчасце: я не адчуваю негатыву, асцярог. Больш за тое — у мяне кожны раз прысутнічае таемная надзея, што разам з аркестрам, салістамі мы зробім штосьці цікавае.

Чарговая творчая надзея паспяхова ўвасобілася гэтым разам і супала з цудоўным юбілеем Аляксандра Анісімава. «Многая лета», выкананае ўдзельнікамі трох хароў і салістамі, а таксама падхопленае гледачамі і ўсімі, хто аказаўся ў эпіцэнтры музычнай падзеі, стала фанфарамі з мірыядаў пачуццяў, здольнымі растапіць сэрцы, каб пабачыць прыгожосць свету.

Многая лета, паважаны маэстра Аляксандр Міхайлавіч! Жадаем гарэць і надалей дабрынёй, спагадай, любоўю і сагравать усіх, хто верыць у ацаляльную моц мастацтва!

Наталля СВЯТЛОВА,
фота аўтара

На творчы Алімп без падрыхтоўкі

15 кастрычніка 2022 года адзначае 60-годдзе вядомы спявак Сяргей Валянцінавіч Франкоўскі. Прозвішча паходзіць са старажытнага шляхецкага роду Рэчы Паспалітай. Нарадзіўся Сяргей у Магілёве ў звычайнай сям'і: маці Людміла Іларыёнаўна працавала на «Лаўсане», бацька Валянцін Акімавіч — шафёр.

Сяргей быў неразлучны з прайгравальнікам і ўсюды цягаў за сабой кружэлку са знакамітай песняй «Камарыкі». Калі ў сям'і адбывалася якое-небудзь свята, хлопчык пачынаў спяваць і танцаваць, а ўзнагародай былі апладысменты... Вялікі ўплыў на маленькага артыста зрабіў дзед Іларыён Іванавіч Пашуцін — былы гімназіст, чалавек музыкальны, які меў добры тэнар і іграў на сяміструннай гітары. Відаць, ад яго і пайшлі тыя «музыкальныя гены», што дапамаглі Сяргею дасягнуць творчага алімпу без спецыяльнай падрыхтоўкі, якая для многіх дзеячаў музычнага мастацтва пачыналася з ранняга дзяцінства. Хлопец, як і многія яго равеснікі, вучыўся у звычайнай сярэдняй школе Магілёва. Але ж цікавасць да музыкі праяўлялася і там.

У 1981—1983 гадах служыў у асобным батальёне сувязі, што пад Лепелем. Падчас службы ў войску навучыўся іграць на гармоніку... Пасля арміі будучы народны артыст працаваў на будоўлі, гадзіннікавым майстрам, токарам, а ў вольны ад працы час і ў святочныя дні падпрацоўваў на вяселлях, імянінах і лічыўся найлепшым у Магілёве выканаўцам народных і папулярных песень.

Ідэя стаць прафесійным артыстам прыйшла не адразу. На адным з вяселляў сябры, узрушаныя яго голасам, настойліва параілі паступаць вучыцца ў кансерваторыю.

У 1985 годзе Сяргей пачаў займацца ў вакальнай студыі таленавітага педагога Людмілы Яўгеньеўны Браілоўскай. Пад яе кіраўніцтвам будучы артыст спасцігаў азы складанага опернага мастацтва.

Сяргей Франкоўскі.

У 1986 годзе магілёўскі самародак паступіў у маскоўскую кансерваторыю, нягледзячы на вялікі конкурс (30 чалавек на месца). Прыёмная камісія была проста зачаравана яго шыкоўным голасам і складанай праграмай. Далей Сяргей трапіў у клас вядомага саліста Вялікага тэатра Расіі Яўгенія Гаўрылавіча Кібкалы, дзе правучыўся адзін год, а потым... нечакана кінуў кансерваторыю.

Ці можна знайсці словы, каб перадаць перажыванні бацькоў? Тым не менш праз некаторы час Сяргей быў прыняты ў родную Беларускую дзяржаўную кансерваторыю...

У 1991 годзе Франкоўскі стаў лаўрэатам Нацыянальнага конкурсу вакалістаў імя Л. Александроўскай, а ў 1993-м — конкурсу імя С. Лемешава... У тым жа годзе быў прыняты ў Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Як відаць, унікальны лірыка-драматычны тэнар магілёўскага самародка не застаўся і без увагі сталічных карыфеяў опернага мастацтва. У 1995 годзе Сяргей Валянцінавіч скончыў Беларускую кансерваторыю, а ў 1997-м асістэнтуру-стажыроўку. Увесь гэты час мудрым настаўнікам Франкоўскага быў аўтарытэтны педагог прафесар Леанід Пятровіч Івашкоў.

У 2004 годзе Сяргей Франкоўскі стаў заслужаным артыстам, а ў 2009-м атрымаў званне народнага артыста.

Сярод прыхільнікаў творчасці Сяргея Валянцінавіча людзі розных пакаленняў. Усё ярчэй і ярчэй разгараецца зорка яго таленту.

У яго бліскучым выкананні прагучалі такія партыі ў нацыянальнай оперы, як Эдгар («Лючыя дзі Ламермур» Г. Даніцэці), Ізмаіл («Набука» Дж. Вердзі), Макдуф («Макбет» Дж. Вердзі), дон Карлас («Дон Карлас» Дж. Вердзі), Герцаг Мантуанскі («Рыгалета» Дж. Вердзі), Манрыка («Трубадур» Дж. Вердзі), Каварадосі («Тоска» Дж. Пучыні), Альфрэд («Травіята» Дж. Вердзі), Калаф («Турандот» Дж. Пучыні), Турыду («Сельскі гонар» П. Масканы), Хазэ («Кармэн» Ж. Бізэ), Герман («Пікавая дама» П. Чайкоўскага), Самазванец («Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага), Князь Галіцын («Хаваншчына» М. Мусаргскага), Уладзімір Ігаравіч («Князь Ігар» А. Барадзіна), Нігіліст («Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» Д. Шастаковіча), Настаўнік («Візіт дамы» С. Картэса), Раман («Сівая легенда» Д. Смольскага), Дубатоўк («Дзікае паляванне караля Стаха» У. Солтана).

Сяргей Франкоўскі валодае тэмбральна яркім, паўнагучным голасам, драматычным тэмпераментам і высокім сцэнічным прафесіяналізмам. Опернае мастацтва ўнікальнага беларускага тэнара было высока ацэнена за мяжой, падчас гастролей у Турцыі, Швейцарыі, Германіі, Францыі, Англіі, Кітаі, Польшчы, Тайландзе і іншых краінах.

Аляксей ШАЛАХОЎСКІ

Сцэна з оперы «Тоска».

Фота з сайта Вялікага тэатра Беларусі

Меў шчасце ствараць

Жыццё вядомага беларускага кампазітара Уладзіміра Солтана было несправядліва кароткае, але плённае і насычанае. За 44 гады, якія адвёў яму лёс, творца падарыў беларускай культуры сімфоніі, песні і музыку для кінафільмаў, а таксама тры оперы, сярод якіх «Дзікае паляванне караля Стаха» — жамчужына Вялікага тэатра Беларусі.

Уладзімір Солтан.

Уладзімір Яўгенавіч нарадзіўся 9 студзеня 1953 года ў Баранавічах. Сям'я будучага кампазітара пераехала ў Брэст, і там у 1974 годзе ён скончыў Брэсцкае музычнае вучылішча (цяпер Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы). З 1974 да 1979 г. навучаўся ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага (з 1992-га Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі) па класе кампазіцыі ў прафесара Анатоля Багатырова. Пад яго ж кіраўніцтвам Уладзімір Солтан скончыў асістэнтуру-стажыроўку ў 1983 годзе.

Падчас вучобы ў 1980 годзе быў прыняты ў Саюз кампазітараў Беларусі. А пасля асістэнтуры-стажыроўкі застаўся ў альма-матар на пасадзе выкладчыка. Да самай смерці працаваў на кафедры інструментоўкі, аранжыроўкі і чытання партытур.

Даследчыкі творчасці кампазітара адзначаюць, што яго музыка вызначаецца інтанацыйнай выразнасцю, насычанай эмацыянальнасцю і нацыянальным характэрам. Глыбокая любоў да Радзімы, шчыры патрыятызм сумяшчаліся ва Уладзіміры Солтане з перфекцыянізмам, высокай патрабавальнасцю да сябе і бясконцым пошукам. Шматжанравая і духоўна багатая спадчына творцы толькі падкрэслівае напоўненасць і багаты ўнутраны свет вядомага беларуса.

У пачатку кар'еры кампазітар аддаваў перавагу вакальным жанрам, а таксама аркестравай і камерна-інструментальнай музыцы. У 1978 годзе, яшчэ ў час навучання ў кансерваторыі, Уладзімір Яўгеньевіч піша сюіту для камернага аркестра «Думкі і настроі». Твор вылучаецца шчырасцю, выразнасцю мелодыі і эмацыянальнасцю.

Сімфонія № 1 (1981) і Сімфонія № 2 (1983) замацавалі характарныя рысы ў творчасці кампазітара: меладычнасць, насычанае гучанне. Канцэрт для віяланчэлі з аркестрам, напісаны Уладзімірам Солтанам у 1987 годзе, належаў сапраўды сталаму майстру. Твор экспрэсіўна маштабны, з музычнай драматургіяй.

Кампазітар напісаў тры оперы: «Мілавіца» (1991), «Пані Ядвіга» (паводле аповесці К. Тарасава «Чорны шлях», 1990) і «Дзікае паляванне караля Стаха» (паводле рамана У. Караткевіча, 1988). Апошні твор і зрабіў імя Уладзіміра Солтана вядомым шырокаму колу аматараў музыкі, а таксама прынёс пастановачнай групе ўзнагароду. Опера была адзначана Дзяржаўнай прэміяй Беларусі ў 1990 годзе.

Прэм'ера «Дзікага палявання караля Стаха» адбылася 6 красавіка 1989 года на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР. Шлях да пастаноўкі гледача быў няпросты.

Уладзімір Яўгеньевіч пачаў работу над творам у позніх 1980-х, але разглядаў яго як сімфанічную паэму. Ідэю стварыць оперу падказаў Віктар Скорабагатаў, тагачасны артыст Вялікага тэатра. Яны разам вучыліся ў кансерваторыі.

Як успамінае Віктар Іванавіч, вядомы кампазітар скептычна ставіўся да оперы, бо лічыў, што не знойдзецца добры аўтар лібрэта. Тады Уладзіміру Солтану прапанавалі на гэтую ролю Святлану Клімковіч. У той час яна з'яўлялася адказным рэдактарам бюлетэня «Тэатральны Мінск», а таксама пісала п'есы для тэатра.

Музычным кіраўніком і дырыжорам быў Яраслаў Вашчак, які актыўна працаваў над пастаноўкай. Народны артыст СССР далучыўся да работы ўжо цяжка хворым і памёр ад анкалагічнай хваробы за месяц да прэм'еры. У выніку яго працу завяршыў народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў.

Сцэнаграфію да прэм'еры оперы стварыў Эрнст Гейдэбрэхт, які ў той час працаваў галоўным мастаком Вялікага тэатра оперы і балета БССР. Яраслаў Вашчак вазіў яго па беларускіх замках: і тых, якія захаваліся, і па руінах, каб натхніць на знаёмства з беларускай культурай. За працу над «Дзікім паляваннем караля Стаха» Гейдэбрэхт атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР.

Сумесны твор выдатных дзеячаў беларускай культуры вытрамаў 22 сезоны ў Вялікім тэатры Беларусі. Такога не было больш ні з адной беларускай операй. Адна з прычын — звышзмястоўнасць оперы, у якой пераплятаюцца драматычная і дэтэктыўная, псіхалагічная і сацыяльная, жанрава-побытавая і этнаграфічная лініі.

Яна ЦЭГЛА

Простыя рэчы

Слова павінна быць жывым

Не раз народны тэатр «Жывое слова» быў удастоены высокіх узнагарод за сваю дзейнасць і вялікі ўнёсак у мастацка-эстэтычнае выхаванне моладзі. З 2012 года тэатрам кіруюць Алеся Сівохіна і Алесь Мойскі. Сёння Алеся распавядае пра тое, куды прывяло яе даўняе юнацкае захапленне.

Алеся Сівохіна.

— Алеся, а што трэба найперш, каб стаць акцёрам тэатра «Жывое слова»?

— Вялікае жаданне і гатоўнасць працаваць. Традыцыйна — талент, іскра, але гэта толькі пяць працэнтаў. Астатнія 95 — наколькі ты гатовы ўкладацца, прыходзіць на рэпетыцыі, не трапляць на сцэну, але «варыцца» ў гэтым матэрыяле.

— Чым адметны ваш рэпертуар?

— Ставім самае рознае. А сёлета, у юбілейны год Якуба Коласа вырашылі зрабіць вялікую кампазіцыю па яго рамане — проста спектаклем гэта не назавеш, бо тут няма канфлікту і развіцця тэмы, але гэта і не класічная кампазіцыя таксама, дзе зазвычай адсутнічае сюжэт… Тэма настаўніцтва, выбару гэтага шляху нас зачаравала. Колас меў такое пакліканне і вырашыў ісці за ім, нягледзячы на цяжкасці, з якімі сутыкаўся.

Летась у нас адбылася прэм'ера — паставілі «Цень» паводле Яўгенія Шварца. Мы з Алесем Мойскім пераставрылі п'есу па-беларуску, і атрымаўся цікавы незвычайны спектакль.

— Чаму менавіта Шварца вырашылі паставіць?

— Яўген Шварц — класік. Чаму класікі называюцца класікамі? Не толькі таму, што добра пішуць, але і таму, што напісанае імі заўсёды актуальна. У любыя часы знаходзіш тое, што адгукаецца. Гэтай пастаноўкай мы пацвярджалі званне народнага тэатра.

— Але ж у асноўным у пастаноўках вы задзейнічаеце айчынных аўтараў?

— Аўтары могуць быць рознымі. Але творы — па-беларуску. Калі няма адпаведнага перакладу, робім яго самі. Так, калі ставілі «Радасць вось такая» па Чэхаву, знайшлі адзін пераклад — ён аказаўся стары і неактуальны, з нуля пераставрылі твор.

— На якіх пляцоўках выступаеце?

— Выступаем і на сцэне педуніверсітэта, і ў музеях, і ў бібліятэках: чытаем вершы, спяваем песні на словы нашых паэтаў.

— А як склалася, што ты кіруеш тэатрам?

— Кірую тэатрам я разам з Алесем Мойскім — для адной мяне гэта было б вельмі цяжка, я ўвогуле слаба ўяўляла сябе кіраўніком хоць чаго-небудзь.

Прыйшла ў калектыў як актрыса ў 2001 годзе. Нічога не ўмела, адзінае — вельмі хацела спяваць. Вельмі любіла з дзяцінства-юнацтва. Першыя гады два выконвала толькі песні пад гітару. Тады кіравалі Алена і Юрась Чарэнкі. Аднойчы пасля чыткі спектакля «Балада» мы запісваліся, хто якія ролі хоча, і я папрасілася на ролю, дзе трэба было толькі танцаваць. Пасля да мяне падышоў Юрась Валянцінавіч і запытаўся, чаму не выбрала штосьці больш сур'ёзнае… Першыя вершы, якія я пачытала са сцэны, Навума Гальпяровіча.

Наталля Кухарава, якая кіравала тэатрам пасля Чарэнкаў, прапанавала мне стаць памочнікам рэжысёра, а потым і рэжысёрам. Актыўна гэтым занялася, у мяне атрымлівалася. Калі ж Наталля сыходзіла, сказала: «А цяпер кіруеш ты…» Амаль адразу ж я зразумела, што адной будзе вельмі складана, і папрасіла Алеся дапамагчы мне ў гэтым.

— Што найбольш складанае ў тваёй рабоце?

— Складанае ўсё, але найбольш — тое, што няма пастаянства: мы не з'яўляемся тэатрам у класічным яго разумені — не маем рэпертуарных спектакляў. Усе акцёры ў нас — студэнты, і з ранку да вечара праводзіць рэпетыцыі немагчыма.

Акрамя таго, мне складана ісці на кантакт з незнаёмымі людзьмі, дамаўляцца пра выступленні, пісаць тэксты. Гэта ўсё робіць Алесь Мойскі. Падабаецца з ім спрацоўнічаць: ён памайстэрску кампануе і тэкст, і сцэнарый, адразу можа вербалізаваць ідэі… Ён структуруе хаос, які ў нас часам узнікае. Мы заўсёды гатовыя адно аднаго падтрымаць…

— Па адукацыі ты псіхолаг. Наколькі гэтая спецыяльнасць задзейнічана ў тваёй працы?

— На першы погляд, можа, і падаецца, што псіхалогія ад тэатра вельмі далёка. Але насамрэч праца акцёраў — гэта праца, у якой ёсць пэўныя псіхалагічныя механізмы і законы. Ёсць геніі, якія гатовы трымаць увагу гледачоў, застаючыся аднымі на сцэне на працягу больш чым гадзіны.

— Але ж вы не рыхтуеце прафесійных акцёраў?

— Не, найперш да нас прыходзяць тыя, хто шукае беларускамоўнае асяроддзе, дзе можна ўдасканаліць сваё маўленне, папрацаваць над сваім голасам, што вельмі важна для настаўнікаў. Тэатр наш і стараўся як гурток для будучых настаўнікаў роднай мовы і літаратуры — каб яны маглі зацікавіць вучняў літаратурай. Заахвоціць прыгожым маўленнем, паказаць, што слова — не пусты гук, яно павінна жыць…

Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Прыгоды пасярод восені

Канал «Культура» Беларускае радыё

У рамках блока ранішніх праграм «У рытме дня» на канале «Культура» Беларускага радыё да ўвагі слухачоў — праекты «Адным штрыхом» з вершамі і мініяцюрамі беларускіх аўтараў, а таксама «Ранішні серыял», дзе гучыць дэтэктыў Нікалае Штэфанеску «Доўгае лета».

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе апошнія старонкі рамана Лідзіі Арабей «Іскры ў папялішчы», з панядзелка пачнецца чытанне кнігі Георгія Марчука «Кветкі правінцыі». У «Радыёбібліятэцы» гучыць твор Франсуазы Саган «Рыбіна кроў». Апавяданні чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і анонсам штотыднёвіка «ЛіМ».

Для аматараў паэзіі ў перадачы «Прачулым радком» у суботу і нядзелю — вершы Леаніда Дранько-Майсюка.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у выхадныя складуць трэцяя і чацвёртая (заключная) часткі радыёспектакля «Найдорф» паводле аднайменнай аповесці Івана Пташнікава (да 90-годдзя з дня нараджэння пісьменніка).

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У гэтыя дні гучыць гісторыя Людмілы Рублеўскай «Прыгоды мышкі Пік-пік». У суботу і нядзелю ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» прагучаць пастаноўкі «Пра дзеда Ая-яй і бабку Оё-ёй», «Не буду прасіць прабачэння», вершаваная казка Уладзіміра Дубоўкі «Мілавіца» і руская народная казка «Мікіта Кажамяка». Штовечар у 21.00 для маленькіх выходзіць «Вячэрняя казка».

У нядзелю і чацвер увазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Развагі пра літаратуру». Радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» гэтага пісьменніка, якая гучыць на «Культуры» ў нядзелю і сераду, прапануе сустрэчу з мовазнаўцай, кандыдатам філалагічных навук Ірынай Будзько.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

9 кастрычніка — 90 гадоў з дня нараджэння Івана Калесніка (1932—1979), беларускага паэта, публіцыста, перакладчыка.

10 кастрычніка — 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Слінчанкі (1922—2010), беларускага скульптара, педагога.

11 кастрычніка — 60-гадовы юбілей святкуе Андрэй Астраумаў (1962), беларускі пісьменнік.

12 кастрычніка — 75-годдзе адзначае Алена Папова (1947), беларускі драматург.

13 кастрычніка — 90 гадоў з дня нараджэння Алены Кобец-Філімонавай (1932—2013), беларускага празаіка.

15 кастрычніка — 115 гадоў з дня нараджэння Рамана Сабаленкі (1907—1975), беларускага празаіка, паэта, публіцыста.

15 кастрычніка — 60-гадовы юбілей адзначае Сяргей Франкоўскі (1962), беларускі оперны спявак, народны артыст Беларусі.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛІМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

18 кастрычніка — у школу № 172 (вул. Ахоцкая, 141) на творчую сустрэчу з дзіцячай пісьменніцай Інай Фраловай. Пачатак у 10.30.

18 кастрычніка — на прэзентацыю кнігі Уладзіміра Мазго «Казкі катамарахода» ў дзіцячую бібліятэку № 6 імя Васіля Віткі (вул. К. Лібкнехта, 98). Пачатак у 13.00.

19 кастрычніка — на пасяджэнне студыі юных літаратараў «Малінаўскія галасы». Творчы кіраўнік Іна Фралова. Пачатак у 16.00.

19 кастрычніка — у Мінскі гарадскі тэатр паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы на спектакль «Цалуйце рукі любыя матуль». Пачатак у 17.30

20 кастрычніка — у Дзіцячы дом № 5 (вул. Адзінцова, 4) на пасяджэнне Літаратурнай гасцёўні «Верасок». Госць — Ірына Токарава. Пачатак у 14.30.

22 кастрычніка — у Цэнтральную бібліятэку імя Янкі Купалы на прэзентацыю зборніка паэзіі і прозы «Памяці слова жывое». Пачатак у 13.00.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія: Таццяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламедаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі: Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава,19 E-mail: lim_new@mail.ru Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны: галоўны рэдактар — 325-85-25 адказны сакратар — 377-99-73 аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98 бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы: 63856 — індывідуальны; 63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў; 638562 — ведамасны; 63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк 13.10.2022 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 735

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004 г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2488

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 22041